Аднак на наступную раніцу, калі хлопчык выйшаў са свайго пакою, каб памыцца й пасьнедаць перад школай, бацька, які нацягваў куртку ля дзьвярэй, спыніў яго, узяў за плечы і ўрачыста прамовіў: “Ты ведаеш, мы тут з мамай падумалі...”

Далей можна было не казаць. Хлопчык заскакаў па вітальні, засьпяваў песьню з мульціка пра Барлісаў і Форана, і маці ўсьміхнулася, гледзячы, як падскоквае ў ягоных майтках ужо зусім сфармаваны стручок. У школе хлопчык здолеў ухапіць адразу дзьве адзнакі ў Аляізы Цішкаўны – пяць за адказ у дошкі і два – за паводзіны, а плюс да ўсяго – чатыры ў Бісэктрысы Катэтаўны і яшчэ пяцёрку ў Магнія Формальдэгідавіча. Дахаты ён ішоў, роўна трымаючы сьпіну, і нават прыбраў у сваім пакоі – прапыласосіў дыван і выкінуў каштаны.

4.

У нядзелю ўся сям’я паднялася рана, не было яшчэ дзевяці, калі мама, у станіку і трыко, выдастала з шафы прыгожую чырвона-зялёную сукенку, а бацька расклаў на канапе свой пацёрты, але яшчэ цалкам прыстойны касьцюм, і пачаў заклапочана яго разглядваць. Дзень мінуў у пакутлівым чаканьні. А пятай гадзіне яны, бліскучыя і напружаны, выйшлі з дому. Зрэшты, хлопчыку давялося вярнуцца, бо мама забыла, ці выключыла яна прас. Прас яна, натуральна, выключыла, але хлопчык, выходзячы з кватэры, прышчаміў сабе дзьвярмі палец. На дзіва, ён нават не адчуў болю, настолькі перабівала ўсе пачуцці зьзяньне хуткага прадстаўленьня.

Ля цырку было шматлюдна, у касу стаялі даўжэзныя чэргі, але ім гэта не пагражала, бацька набыў квіткі яшчэ ў сераду. Вуліца каля цырку была ўся застаўленая самымі рознымі машынамі. Зь іх, круцячы плячыма, выбіраліся іншыя хлопчыкі, увешаныя золатам, усе лакіраваныя й добра змайстраваныя. Яны пагардліва акідвалі позіркамі пралетарскіх дзяцей і накіроўваліся ў будынак, звысака ківаючы натоўпу, у той час як іх бацькі, выставіўшы ненармальна белыя зубы, як малпы крыўляліся ў слухаўкі сотавых тэлефонаў:

"Ды вось малога ў цырк вяду..." Хударлявыя дзяўчынкі пацягвалі аголенымі плячыма, быццам ім было халодна, хаця на двары быў вельмі цёплы, утульны верасьнёўскі вечар. Нейкі дзіцёнак, трымаючы за руку масыўнага лысага тату, стрэліў у хлопчыка зь пісталету. Хлопчык зарубіў яго лазэрным мечам і пабег даганяць бацькоў.

Фае віравала. "За лёдавам станавіцца няма сэнсу,"– сказала маці, спалохана азіраючыся па баках. Смурныя дамы аглядалі з пагардаю яе чырвоную зь зялёным сукенку й зьнікалі ў залі. "А памойму, яна вельмі ёй пасуе,"– падумаў хлопчык.

Яны занялі свае мейсцы, і пах мокрае замшы тут жа прапітаў іх. Гэта быў прыемны і хвалюючы пах, і хлопчыку захацелася, каб ён не выветрываўся ніколі. Ён нават панюхаў рукаво свайго швэдру. Пах быў усепераможны.

Нарэшце згасла сьвятло, заіржала, як конь, які узьняўся на дыбкі, музыка. Той самы чалавек, якога хлопчык бачыў па тэлевізары ў рэклямным роліку, выйшаў на арэну і абвясьціў першы нумар. Гэта былі танцуючыя сабакі. Дзеці навокал з захапленьнем лізалі лёдава, яно крапала ім на прарэхі й туфлі. Дзяўчынкі захоўвалі пыхлівы выгляд, часта-часта, быццам міргаючы падносілі да доўгіх вейкаў біноклі. "Наташы Растовы"– чамусьці падумаў хлопчык.

Сабакі саступілі мейсца малпам, потым былі сумныя жанглёры, якія выклікалі ў вачох рабізну. Пасьля жанглёраў на арэну выйшаў фокусьнік, які ператварыў яйка – у курыцу, шыла – у мыла, а чорнае – у белае. Хлопчык зь нецярпеньнем чакаў запаветнай хвіліны. Але пасьля фокусніка выступалі акрабаты, якія, выкарыстоўваючы даўгія вяроўкі, напалі на дзяцей з супрацьлеглага сэктару. "Калі ж будуць беларусы?"– грыз пазногці хлопчык. Але й на мейсца акрабатаў прыйшлі два клоўны, якія ўсіх папросту замучылі. Спачатку яны павыторгвалі дзяцей зь ніжніх радоў, паставілі ўсіх на арэне ў шарэнгу й надавалі кожнаму па попе, а потым доўга й нясьмешна жартавалі, скончыўшы зусім ужо непрыстойным жартам пра насосы, засосы і адсосы. Нават у цемры хлопчык заўважыў, як пачырванела мама і кінула на яго зьбянтэжаны, просячы прабачэньня позірк. Клоўны сыйшлі, у залі запалілася сьвятло.

– А дзе ж беларусы?– Хлопчык ледзь не расплакаўся ад расчараваньня.

– Антракт,– працадзіў праз зубы ягоны добра парублены лазэрным мечам сусед.

Такім чынам, мінула ўжо гадзіна, хлопчык ужо адседзеў сабе азадак, а запаветнага відовішча ўсё не было. У антракце яны ся-

дзелі на сваіх мейсцах, вырашыўшы, што абавязкова згубяцца, калі выйдуць у перапоўненае фае. Стракаталі тэлефоны, гучна сьмяяліся бліскучыя, быццам навагоднія елкі, жанчыны. Стагодзьдзе мінула, пакуль сьвятло згасла зноў.

Усё было так, як у рэкляме, толькі ў мільён разоў больш цудоўна. Як іншаплянэтнікі, беларусы йшлі па рассыпчатай серабрыстай дарозе, якая зьнікала ў космасе. Нібы вельмі багаты дзядзька набыў Млечны шлях і выпусьціў на яго гэтых сумуючых па волі зьвяркоў. Іх грацыёзнасьць зачароўвала. Было жудаснае і невыразнае адчуваньне, што зараз увесь Сусьвет упадзе на галаву. “Гэта ж трэба так выдрэсыраваць,”– гучна сказаў нехта за сьпінай хлопчыка. У поўнай цішыні беларусы рухаліся, як міражы, у паветры, то зьнікаючы, то зьяўляючыся зноў. Нейкая дзяўчынка ўскрыкнула ад захапленьня. Сьвятло мякка ападала на сьцены цырку, расступалася перад яркай дарогай, якая вяла ў нязьведаныя касьмічныя далечы. Беларусы йшлі, павольна круцячы лапамі зьзяючыя шары, але ў гэтым не адчувалася аніякага прымусу. І на самым грэбні хвалі захапленьня, якая захінула цырк, нечакана і ў той жа час вельмі дарэчы загучала ціхая музыка. Такой хлопчык ня чуў яшчэ ніколі. Ад ні з чым не параўнальнага відовішча і плаўных, не вясёлых, не маркотных гукаў хацелася плакаць ды любіць. Маму, радзіму, бабулю, Бісэктрысу Катэтаўну, бацьку, дзяўчынку, якая сядзела ў ніжнім радзе, адкрыўшы рот і не заўважаючы лёдава, якое рапала ёй на сукенку. Як гэта было казачна!

Музыка абарвалася, беларусы замерлі й вельмі лёгка, як пухіры, апусьціліся на арэну. Запалілі сьвятло, выйшаў дзядзька ў чорным і павёў беларусаў за кулісы, груба торгаючы за паваดкі. Заля выбухнула апладысментамі. Кагосьці апырсквалі джын-тонікам, вяртаючы ў прытомнасьць. Хлопчык, карыстаючыся тым, што маці й бацька ўсё яшчэ глядзелі ўніз, ціхенька споўз са свайго крэсла й пабег – паміж ног-ног-ног – туды, дзе яшчэ калыхалася заслона. Ён па-майстэрску праскочыў міма чалавека ў аранжавым гальштуку й хутка дагнаў дзядзьку ў чорным, які вёў беларусаў да клетак. Беларусы былі ўсе мокрыя й зблізку не такія прыгожыя, але нічога, такая ў іх праца. Хлопчык падыйшоў да іх. “Можна пагладзіць?”– запытаў ён, дрыжучы ад нецярпеньня. “Ты як сюды прапоўз?”– вохнуў дзядзька. Але насамрэч ён быў добрым і чулым чалавекам, які любіў ня толькі жывёлаў, але й дзяцей. Хлопчыку нават дазволілі пакарміць беларусаў праз клетку.

лістапад 2001

ДЗЬВЕ ТЫСЯЧЫ СЛОВАЎ ПРА ЗАВАЛЮХІНА

Ён сядзіць непрыемна блізка, без супынку гаворыць і ўвесь час хістаецца – ён хістаецца так энэргічна, што лавачка пад намі ажно ходзіць хадуном: я сяджу побач і пакорліва трываю гэтую марскую хваробу. Аднак самае жахлівае ў тым, што хістаньне лавачкі вымушае мяне аднастайна ківаць галавой, і таму звонку ўсё выглядае такім чынам, быццам я згодны зь ягонай балбатнёй. Насамрэч нават паралізаваны й нямы Завалюхін выклікаў бы ў мяне гарачы пратэст.

Хістаньне Завалюхіна – той жа прыроды, што і грукат пальцамі па стале, пагрызаньне ўласных пазногцяў, хрумсьценьне косткамі або вышлёпваньне на губах папулярных песенек (а то, бывае, яшчэ хто-небудзь са знаёмых, сымпатычны, здавалася б, чалавек, сярод вясёлай размовы пусьціць зьнянацку ў скокі сваё правае калена – далібог, у такія хвіліны хочацца па-галівудзку спыніць жыццё як форд мустанг і званітаваць у фортку), гэтае хістаньне – найбрутальнейшы від такіх вычварэньняў. Сам Завалюхін, натуральна, не ўсьведамляе таго, што адбываецца зь ягоным целам падчас хістаньня...а можа быць, яму падаецца, што ягоны торс, які абдымаюць пад рэбрамі безвалосыя, кароткапалыя рукі, грацыёзна й ледзь прыкметна рухаецца ў такт нячутнай чароўнай музыцы – дык вось не: Завалюхін папросту сядзіць і тупа хістаецца ўперад-назад, а пры гэтым яшчэ й гаворыць. Ня ведаю: у мяне большую прыхільнасьць выклікае чалавек, які п’е ацэтон, чым пажыральнік уласных пальцаў, я хутчэй абняў бы забойцу, чым таго, хто мае звычку стукаць костачкамі пальцаў, напрыклад, па шкле. Напэўна, гэта нэрвы. У іх нэрвы. І ў мяне.

Завалюхіну, вядома ж, я нічога падобнага ніколі не казаў. Мы зь ім, здаецца, сябры. Прынамсі, ён так думае. Што ж, нядаўна я нарэшце ўцяміў значэньне гэтага слова. Сяброўства – гнюснае спараджэньне калектывізму. На думку Завалюхіна, наколькі я разумею, сяброўства – гэта гарэлка, пяльмені й потым задушэўная размова, якая мусіць складацца зь ягонага п’янага трызьненьня й майго спачувальнага маўчаньня. Беражы мяне божа ад сяброў і сяброўства.

І ўсё ж я распавяду пра яго.

Напрыклад, Завалюхін і жанчыны. Рэч у тым, што мой сябра

мае рэпутацыю вялікага жартаўніка. Ня памятаю ўжо, зь якіх часоў гэта павялося, але ў нас заўжды было прынята ўсё, што б ні казаў Завалюхін, лічыць неверагодна сьмешным і дасьціпным. Яму такое становішча, натуральна, да спадобы – хто з нас ня марыў пра пажыццёвую ролю душы кампаніі? Аднак мы ўздыхаем і адыходзім убок, да сваіх страхаў, сьлёзаў і расчараваньняў, у абдымкі сваёй ненавіснай і таму яшчэ больш мілай слабасьці. Завалюхін жа даўно ня мае на гэта права. Ён абавязаны жартаваць. Завалюхін упэўнены, што ўсе навокал толькі й чакаюць ад яго што ўдалага жарту. Думаю, гэты чалавек ніводнага разу не дазволіў сабе сумненьня ў трапнасьці свайго гумару. Аднак доля штатнага жартаўніка пачынае ціснуць на Завалюхіна. Яму хочацца плакаць. Ды вось толькі гэта веселунам забаронена. Увечары, на лесьвічнай пляцоўцы, Завалюхін трывожна абкурвае сваё рагочучае сэрца й нечакана ловіць сябе на тым, што баіцца – баіцца таго, што адмовіўшыся ад акладу жартаўніка, стане для нас пустым месцам. Жартаўнікам, якімі б пляскатымі й пошлымі ні былі іхныя жарты, плоцяць прыстойна. Іх нязьменна запрашаюць у госьці, частуюць гарэлкай, жанчыны падсаджваюцца да іх бліжэй, і калі ты, на сваё шчасьце, ня быў абраны жартаўніком у якасьці сёньняшняй ахвяры для яго кпінаў, то ты таксама будзеш аж да разьвітаньня на аўтобусным прыпынку расьцягваць вусны ў звыкла балючай для сябе ўсьмешцы, нібыта на тваім твары засохлы клей, і паляпаеш зажартаванага і апляванага няўдачніка па плячы. А штатны гумарыст пойдзе праважаць дахаты рудавалосае хіхіканьне з маленькімі грудзьмі, і ты адчуеш палёгку, бо можаш спакойна выплюнуць прамінулы вечар у ракавіну на кухні, а Завалюхін будзе вымушаны яшчэ гадзіну запар гумарыць, гумарыць, гумарыць: у прамерзлым трамваі, на ўскраіне места, з пунсовымі вушамі, без цыгарэтаў, у цёмным пад’езьдзе, у цеснаце тамбуру, бо каму ён цікавы, смурны й маўклівы Завалюхін, мёртвы Завалюхін, не маўчы, Завалюхін, жартуй, і тады табе дадуць пацiскаць. Ну, я пайшла, Завалюхін. Патэлефануй мне, Завалюхін. І толькі ўнізе, адкуль чуецца такое выразнае бляяньне, можна будзе не жартаваць – трэба будзе бегчы.

Вядома ж, як толькі Завалюхін трапляе ў арбіту жаночага сьвету, ён адразу ж пачынае гіранізаваць і кідацца сваімі вострыцамі. Ён проста не ўяўляе сабе, як можна размаўляць з жанчынамі інакш. Ён ведае, што ён шыкоўны. Чароўны мужчына. Я назіраю за ім праз паўапушчаныя вейкі. Мне добра, бо мяне тут

ніхто не заўважае. Хвіліну таму мне кінулі: “Будзь прасьцей тварам і людзі да цябе пацягнуцца”, вось, бадай, і ўсё, што мне сказалі за сёньняшні вечар. А я не хачу быць прасьцей, бо усё няпроста, усё вельмі дрэнна, складана й трагічна. Я назіраю за сваім сябрам, гэта я прывёў яго сюды. Ён сядзіць між трох жанчын і жартуе. Завалюхін іскрыцца жартамі. Ён выбухае показкамі, як гарэзьлівы фэервэрк, ён асьцярожна заігрывае з пошласьцямі й робіць рызыкоўныя камплімэнты. Ён – душа кампаніі. Ён пачуваецца ўтульна, ён ганарыцца сабой. І раптам я заўважаю, што празь сьмех жанчын праступае неймаверная стома, што іхныя ірты зь цяжкасьцю ператвараюць ва ўсьмешкі прыгожыя шырокія позехі. Яны ж насамрэч не ідыёткі, гэтыя прывабныя й глупаватыя на выгляд кабеткі, яны ж разумеюць, што жарцікі Завалюхіна ня вартыя нават мімалётнай усьмешкападобнай здані, яны ведаюць, што прамоўленыя імгненьне таму словы Завалюхіна каштуюць менш, чым бурая вада, што зьнікае ў адтуліне ванны, — але яны жанчыны, і ім загадана згодна зь нейкімі дзікімі тысячагадовымі законамі сьмяяцца ў вадказ на мужчынскія жарты, а Завалюхіну загадана прыкладна тымі ж цыркулярамі й дэкрэтамі жартаваць, гумарыць, кпіць. Я бачу, што насамрэч жанчынам хацелася б сесьці з намі на падлогу й, скінуўшы ўсе гэтыя гіпсавыя маскі, пагаварыць з намі як зь сябрамі, проста шчыра пагаварыць – але яны ніколі ня пойдуць на гэта, і апускаюць вочы, і натужна чырванеюць, і Завалюхін заліваецца закіпелым імбрыкам. Паміж імі глухой сьцяною стаяць сэксуальнасьць і Завалюхінская пасада штатнага жартаўніка.

Па дарозе дамоў я раблю памылку й распавядаю яму пра гэта. Завалюхін мярзотна шчоўкае пальцамі па сваёй шчацэ й жартуе. Я ўзгадваю, як глядзелі на Завалюхіна мужчыны. З зайздрасьцю. Тым ня менш дахаты мы вяртаемся ўдваіх. Ня тая кампанія. Трошкі разумнейшая, чым звычайна. Жанчын мне шкада, а з Завалюхіным я стараюся хутчэй разьвітацца. Дарэчы, я ведаю, што ён цнатлівец, а цнатліўцы выклікаюць у мяне алергію. Разумею, што гэта дурата, але калі я дакладна ведаю, што мужчына цнатлівы, мне гідка нават паціскаць яму руку – мне здаецца, што дакранаючыся да яго, я дакранаюся да ягоных тых самых ворганаў.

Карацей, гэта адно з самых панылых відовішчаў на сьвеце – жартаўнік, які вымушаны жартаваць.

Завалюхін любіць гаварыць пра тое, што ён мой лепшы сябра. Тое, што ён лічыць сябе ім, дазваляе Завалюхіну прыпірацца да нас

ў дзьве гадзіны ночы й спаць на кухні, атручваючы нашае сандалавае паветра сваім перагарам. Назаўтра ён падымаецца на досьвітку, ідзе ў краму і ўрачыста прыносіць адтуль бутэльку гарэлкі, такой салодкай для таго, хто пахмяляецца, і такой ванітоўнай для мяне, які толькі прачнуўся. Завалюхін прымушае мяне выпіць і пакуль мы яго кормім, распавядае нам зьмест учорашняга кавээну. Вось яшчэ адна рэч, адно ўзгадваньне якой здольнае адбіць у мяне апэтыт да жыцьця. Я сапраўды не разумею, што вясёлага можа быць у сузіраньні сотні завалюхіных, якія б'юцца ў параксызму свайго жартаваньня, а да таго ж яшчэ сьпяваюць, хто ведае навошта, нейкія перайначаныя песенькі, і самае вар'яцкае – заля надрываецца ад рогату, і сцэна трасецца: грошы патрачаны не дарэмна! Завалюхін у сваёй стыхіі. Аднак я ветліва сьмяюся. Жонка, ледзь стрымліваючыся, ідзе ў залю, я ведаю, што яна трывае ўсё гэта толькі дзеля мяне, а наш мілы сябра патрабуе гітару.

Вось яшчэ адна жарсьць Завалюхіна. Ён любіць музыку. Ён любіць сьлязьлівую, патэтычную калярокавую эстраду савецкіх часоў, але гэта яшчэ ня самае жахлівае. Завалюхін сам піша песьні й сьпявае іх пад уласны акампанімэнт. Ён б'е па струнах, і наша гітара, не вытрымліваючы, пачынае румзаць – яна добра ведае, што такое апынуцца ва ўмелых завалюхінскіх руках. Правая кісьць Завалюхіна сутаргава торгаецца, левая ўчапілася ў струны як у маё горла. Прыгожа фальшывячы, Завалюхін енчыць нешта псэўдарамантычнае, хаця мне здаецца, што песьня пра інцэст. Мэлёдыя, згодна з уяўленьнямі Завалюхіна – гэта калі голас неадступна сьледуе за ўдарамі пальцаў па струнах, нібы пад строгім канвоем, такім чынам, завалюхінскія песьні – гэта занудныя рэчытатывы пра каханьне, якія выконваюцца казьліным голасам і з п'янай сьлязою ў хітрым кутку правага вока – трагедыя! Я сяджу побач і пазіраю на гарэлку ўжо без усялякае агіды, як на паратунак. Завалюхін заводзіць новую, на гэты раз не сваю, хаця, па шчырасьці, кожная песьня, якую ён выконвае, падаецца напісанай маім адданым сябрам. У вачох Завалюхіна я бачу, што яму ажно карціць, каб я падцягнуў у прыпеве. Я куляю ў сябе гарэлку й бадзёра стараюся ўдаць такі ж казьліны голас: "У комнаце зь белым паталком!..", аднак, кажучы напраўду, мой прыродны голас не казьліны, ён хутчэй мядзьвежы, а ім, медзьведзям, як вядома з славянскага фальклёру, некалі пераехала вушы дагістарычным камбайнам. Па тым, зь якім грукатам жонка зачыняе дзьверы ў залю, я здага-

дваюся пра посьпех нашага дуэту. Котка хаваецца ў шафу, падалей ад завалюхінскіх мадуляцыяў. Завалюхін просіць мэдыятар. Божа, навошта я гэта трываю? Вазьмі, вазьмі вострую брытву, Завалюхін, і ўнясі ў сябе праўкі! Аднак мяне чакае новая бяда. Завалюхін, мой дружочак, жадае даведацца, якая ягоная песьня мая ўлюбёная. Я пакутліва перабіраю ягоныя шэдэўры ў галаве й нарэшце называю нешта самае кароткае. Натуральна, Завалюхін прасьпявае лепшаму сябру ягоную ўлюбёную песьню. Нам вельмі весела, вельмі.

Завалюхін лічыць сябе надзвычай таленавітым. Неяк ён прызнаўся мне, што ягоны паэтычны талент, напэўна, усё ж пераўзыходзіць ягоны талент кампазытара. Што ж, магчыма. Калі я думаю пра гэтыя два асноўныя, бо Завалюхін, натуральна, мае і яшчэ безьліч іншых талентаў, *проста яны ня так кідаюцца ў вочы*, — дык вось, пра гэтыя два асноўныя таленты Завалюхіна, я чамусьці заўсёды зьбіваюся на думкі пра сіямскіх блізьнятаў. Будучы, скажу шчыра, поўнай бяздарнасьцю, Завалюхін не жадае дасягаць чагосьці й вучобай. Больш за тое, пра страшэнныя правалы ў будынку сваёй асобы ён гаворыць як пра разумна зробленыя вакенцы. Ён упэўнены ў сваім інтэлекце. Ён марыць пра тое, каб выдаць зборнік вершаў, хаця дагэтуль сьвята верыць, што "малако" рыфмуецца з "кімано" (Завалюхін прытрымліваецца погляду, што рыфма – "гэта калі два словы сканчаюцца на адну й тую ж літару") – справа ўскладняецца тым, што для Завалюхіна ўсё, што ня ў рыфму, ёсьць прозай. Прозу Завалюхін піша таксама, але казаць пра гэта ў мяне ўжо не стае моцы. Прачытаўшы кніжку пра Суворава, Завалюхін пачаў лічыць сябе знаўцам гісторыі й выклікае мяне зрэдзьчас на навуковыя дыспуты – ці варта казаць, што я заўсёды іх прайграю.

Вось тое, што мой сябра папросту паталягічна няздольны вывучаць замежныя мовы, факт сапраўды неаспрэчны. Запомніць дзесяць нямецкіх дзеясловаў для яго непасільная задача. Само па сабе гэта, натуральна, ня страшна, ня ўсе траглядыты – паліглоты, але мяне прыводзіць у шаленства тое, што Завалюхін гаворыць пра такое бясьсільле як пра цікавую ўласьцівасьць сваёй творчай натуры, пра нешта кшталту разынкі ўласнай псыхікі. Я думаю, што гэта істотны недахоп, але госпадзе! — паводле ягоных словаў, гэта "забавно". Мяне, прыводзіць, у, шаленства, — у ціхае шаленства, спадарства, у ціхае шаленства, нямое шаленства, бо я ніколі не казаў Завалюхіну нічога падобнага.

Завалюхін мае безьліч люмпэнскіх звычак, гідкіх, савецкіх,

звычак у маім ўяўленьні антрапаморфных, бо кожная зь іх нагадвае сваёй самастойнасьцю тлустую базарную бабу, якая можа і з Парыжу за адзін дзень зрабіць калгас. Завалюхін не разумее, што кепскага ў сьмярдзючых піўнухах, футбольных фанатах, піянэрскіх лягерах, расейскіх акупантах, паленьні недапалкаў, сэнтымэнтальных балядах, кавээну, антысэміцкіх кнігах, мацернай лаянцы, шпалерных цьвяточках, жоўтай прэсе, сьвежых анэкдотах, не разумее, што такое тактоўнасьць, гігіена, воля, адзінота, літаратура, густ, сям'я, сэкс, годнасьць, маўчаньне. Яму, нягледзячы ні на што, лёгка жыць на сьвеце. А мне страшэнна няўтульна, пагатоў зь ім; я адчуваю, што на маім целе вырас тоўсты шанкр пад назвай Завалюхін, і я ня ведаю, як мне пазбавіцца ад яго. Напэўна, я ня маю пачуцьця гумару. Але калі я ўспамінаю, наколькі верны сябра мой Завалюхін, мяне ахоплівае роспач.

Верагодна, мы самі вінаватыя ў тым, што ён упэўнены ў сваёй выключнасьці. Бо ніколі не асьмельваліся сказаць яму праўду. Бо шкадавалі яго, нават калі ня мелі для гэтага нагодаў. Бо замянялі справядлівасьць сяброўствам. І Завалюхін жывіўся нашым маўчаньнем, нашымі фальшывымі ўсьмешкамі, ухваленьнем кожнага ягонага выбрыку. Але сёньня позна зьмяняць яго – любое слова супраць ён успрымае як зайздрасьць. Ды й вось што мне хочацца сказаць: мой сябра, калі напраўду, быў такім ад пачатку. Бо такімі ж былі цэлыя генэрацыі Завалюхіных, генэрацыі хамаў і паразытаў. А апошнія пяць гадоў адзіным, што нас аб'ядноўвала, была гарэлка. Нашыя дарогі мусяць разысьціся, няхай для гэтага спатрэбіцца і хірургічнае ўмяшальніцтва. Я мяркую, што калі пасадзіць у вадну турэмную камэру таленавітага чалавека й Завалюхіна, то яны нават падземны ход для ўцёкаў будуць капаць у розных месцах.

Цяпер Завалюхіну вельмі пагана, ягонае жыцьцё руйнуецца, і мне салодка назіраць, як ён дэградуе проста на вачах. Самы час прымаць рашэньне. Ён заўсёды паразытаваў на мне, дык нашто пазбаўляць чалавека права несьці за гэта адказнасьць? Завалюхін сядзіць непрыемна блізка, без супынку гаворыць і ўвесь час хістаецца. Я гляджу проста перад сабой і пасьміхаюся. У пэўны момант Завалюхін паварочваецца да мяне й нешта раззлавана бурчыць.

— Што? – прамаўляю я пасьля паўзы зусім абыякава. – Ты штосьці казаў ці мне падалося?

Ён лаецца, а я падымаюся і іду наперад, не абарочваючыся. Бывай, Завалюхін! Бывай назаўсёды. Свае дзьве тысячы словаў ты заслужыў.

ЦЁПЛЫЯ РЭЧЫ, ХАЛОДНЫЯ РЭЧЫ

Джым Хігінс каўтануў віскі, абыякава зірнуў на сваю баявую сяброўку, якая ўсё яшчэ спала, ды схаваў цыгарэты ў кішэнь скуранай курткі. Пры гэтым бляклым ранішнім сьвятле сяброўка ўжо не здавалася такой бліскучай бляндынкай, як учора, проста – пацяганая голая лялька з пазалеташнім грымам, ды Джым ужо й ня памятаў, у якім бары ён яе падчапіў. Бутэльку з яблычным джын-тонікам Джым выкінуў у вакно, а часопіс схаваў пад падушку – і, як высьветлілася, вельмі своечасова, бо ў пакой зазірнула маці, прытрымліваючы на грудзёх халат, і, натуральна ж, завяла сваё:

— Зноў ён паліў у фортку... Дзіма, я колькі табе казала? Я ж бачу, вунь на падваконьні попел. Гэта агідна! Сьмярдзіць на ўсю кватэру. І выключы нарэшце сваіх дэбілаў, увесь дом разбудзіў.

— Адкуль ты ведаеш, што гэта агідна, — змрочна прабурчаў Джым, нацягваючы джынсы. – Ты ж не паліла ніколі ў жыцьці. Паспрабавала б хаця б раз, перш чым нудзець.

Маці пакачала галавой, паклікала бацьку ды пайшла гатаваць сьняданак. “Скажы яму, я ўжо не магу болей” – і бацька прамармытаў нешта ды схаваўся ў прыбіральні. “Ты надоўга?” – Джым нехаця пайшоў у лазьніцу, і пастаяў там трохі са шчоткай у роце, каб забіць час, а калі выйшаў на кухню, то бацькі ўсё яшчэ не было. “Калі ты нарэшце ўцяміш, што бацька ў цябе адзін, і я адна?” – сказала маці ўжо спакайнейшым голасам, пераварочваючы на патэльні каўбасу. З радыёкропкі ліліся пахавальныя маршы. “Прыбіральня ў нас у кватэры таксама адна”, — парыраваў Джым і зазірнуў у лядоўню.

— Ну, паехалі, ці што? – бацька змахнуў са стала крошкі.

— Куды гэта? – падазрона запытаўся Джым, адсунуўшы ад сябе кубак з гарбатай. Але тут да яго дайшло, і настрой адразу ж палепшыўся, і ён нават прайшоўся з бацькам да стаянкі. Ля апошняга пад’езду на лавачцы паныла сядзелі, відавочна ня ведаючы, куды сябе падзець, трое прыдуркаў, зь якімі Джым зьбіраўся запісваць альбом, Джым адмахнуўся ад іх, уяўляючы, аднак, з прыемнасьцю, як прыйдзе ў панядзелак на рэпэтыцыю ў новых, суворых, смаліста-чорных... Як сёньня будзе крочыць у іх па праспэкце... Адзін з прыдуркаў, якому бацькі падарылі нядаўна бас-гітару, нейк назваў гэты абутак даволі ўдала – яны якраз учацьвярох сядзелі тады ў цэнтры гораду ды пілі піва, і тут перад імі лянотнай паходкай сьвятога прафляніраваў Сам, пальцы ды вушы ў пярсьцёнках,

грыву трэпле вецер, скура падзыньквае, ведама ж, столькі жалезьзя, на крывых мускулістых нагах напінаецца чорны аксаміт, побач сапраўдная Кэці Вампайр на высачэзных абцасах: акупантусы – вось як ён іх назваў, акупантусы, на шнуроўцы, з мэталічнымі мыскамі, на якіх танчаць забойчыя промні, высокія, магутныя, як два чорныя вершнікі, бадай, па дзесяць кіляграмаў у кожным, такімі забіць можна, з плятформамі нібы пратэктары на шынах джыпу. Абутак для такога, як я. Толькі б удалося іх уламаць, гэта складана, але магчыма. І тады па праспэкце, з Аляксандраю і расшпіленай курткай, з-пад якой паказвала ўсяму сьвету безыменны палец шэрая зацёртая байка. І на лекцыях з-пад парты ногі ў акупантусах незнарок высунуць таксама няблага, няхай іхныя погляды спатыкаюцца, што яны наогул пра мяне ведаюць.

Яны падабралі ля прыпынку маці ды, пратырчаўшы колькі хвілінаў у пробцы, выпаўзьлі на кальцавую. Іхны шлях ляжаў на адзін з тых рынкаў за горадам, падобных да ракетных ангараў, дзе ёсьць усё, што душа пажадае, калі, вядома, душа жадае таннага і аднолькавага. Рынкаў-гарадоў, дзе не патрэбныя візы, дзе ў завешаных моднымі рэчамі лаўках адбываюцца драмы ды камэдыі, дзе ў палатках за хісткімі прылаўкамі можна пражыць жыцьцё, нават не заўважыўшы, прычым гэта тычыцца як прадаўца, так і пакупніка; дзе ёсьць свае кварталы чырвоных ліхтароў, у якіх можна за бясцэнак падгледзець, як бессаромна прымервае станік студэнтка пэдагагічнага ці багатая матрона; стракатых вольных гарадоў, якім віетнамскія і азэрбайджанскія закусачныя надаюць непаўторны дзіўна-усходні калярыт, дзе маецца свая тапаніміка і дзе дзейнічае толькі адзін закон – эканамічны, перад якім усе роўныя і якому падпарадкоўваюцца нават жабракі; гарадоў-рэспублік, у якіх сканчаецца рублёвая зона, у якіх можна без праблемаў завербавацца жаўнерам або піратам, куды імкнуць з усяе краіны бяздомныя сабакі й коткі, гарадоў, дзе заўжды лета, гарадоў, дзе неахвотна плоцяць даніну мэтраполіі. Гарадоў, дзе ніводная рэч не бывае лішняй, дзе суд адвеку зьдзяйсьняецца хутка й незваротна, тэрыторый, дзе не бывае ночы; пярэстых выспаў, на якія хаця б раз у жыцьці даводзіцца высаджвацца.

Маці й бацька Джыма пачуваліся тут у сваёй стыхіі – прынамсі, ім зусім не замінаў натоўп, які безвач ляцеў насустрач, бачачы толькі тое, што хацеў бачыць, і чуючы толькі сябе. Нахіляючы галовы і ўсё адно адчуваючы, як па карку ды сьпіне праводзяць

сьляпымі лапамі сукенкі ды кашулі, яны прабраліся нарэшце да абутковага кварталу. Прадаўцы таропка сьнедалі з плястыкавых талерак, з поўнымі іртамі называючы цэны, каціў свой камень кудысьці смуглявы Сызыф, раз-пораз весела выгукаючы: “Пабэрэгіс!”, палаткі былі сырымі ад туману; як і заўсёды за гарадзкой рысай, тут яшчэ там-сям ляжаў шэрымі плямамі нераспрададзены сьнег, на рэдкіх пустуючых месцах крэслы няўпэўнена трымалі на плячох адно аднаго. Пахла скурай і фарбай, чабурэкамі й чамусьці серай. На адным з прылаўкаў стаялі беспрытульныя, жахлівыя ў сваёй жаласьлівасьці туфлі, два дзясяткі туфляў, і ўсе на адну нагу. Дамскі абутак выглядаў весялейшым – напэўна, праз большую разнастайнасьць формаў. Джым прабег усьлед за бацькамі яшчэ дзьве вуліцы, грэючы ў рукавах рукі. З агромністага корабу квадратны чалавек даставаў зваленыя як папала чаравікі, і не было чаравікам ні канца, ні краю. “Вось,” – абрадавалася маці, — “Глядзі якія сымпатычныя”. Джым матлянуў зь нянавісьцю галавой. “Табе трэба купіць карычневыя”, — сказала маці, з жалем азіраючыся. “І лепш на замку, так практычней. Да лета спакойна паходзіш”. Яны завярнулі за рог Чаравічнай вулачкі, “Вось тут мы абавязкова знойдзем”, праверашчала маці й схапіла яго ў захапленьні за руку – Джым зморшчыўся ды адразу забраў руку назад, але рука была ўжо заплямленая, і ён пасьпеў заўважыць, як пагардліва на яго паглядзела маладая, можа, на пару толькі гадоў старэйшая за яго прадавачка, і ўсьміхнулася, а маці ўжо цягнула Джыма да яе ў бардовы паўзмрок, і ён вырываўся, і прадавачка сказала нешта з мацярынскай інтанацыяй, і грузін з суседняй палаткі махаў яму рукой, ратуючы ды робячы адначасова свой бізнэс, і невядома, што было больш ганебна; у грузіна таксама, як і скрозь тут, у гэтым тупа рагочучым квартале, быў абутак для будучых мамаў і татаў, для юных кар’ерыстаў і надзеяў спорту, для дыскатэк і пасьля дыскатэк, для маленькіх дарослых і для дарослых падлеткаў, і дарэмна Джым спрабаваў угледзець у вунь тых высокіх чаравіках намінку на акупантусы, марна ён намагаўся захоўваць незалежны выгляд – уся бясконцая вуліца зь яе абыякавымі ці празьмерна навязлівымі прадаўцамі зьвярнула ўвагу на Джыма, і, ацэньваючы спрытным вокам плацёжаздольнасьць бацькоў, зазірала яму насьмешліва ў твар: ну выбяры ты што-небудзь, пацан, давай, не засмучай тату й маму. Джым спыніўся, і тут жа яго паманілі пальцам: тлустая баба, падобная да гарылы, вылезла з-за свайго ўкрыцьця ды сказала гучна: не дурыце хлопцу галаву, у мяне ў са-

мой такі, суеце яму ўсялякую дрэнь, вось, я маю тое, што ты хочаш, і ў Джыма задрыжэлі вусны, а баба села яму пад ногі і ўжо хацела разьвязаць падраныя матузкі на Джымавых ботах, а ў руках у яе былі карычневыя вузканосыя калекі, з замкамі нібы ад авосек, з надпісам "God Boy!" збоку. Ён падняў нагу, вырваўшы яе з абдымкаў бабы, якая ашчэрылася пакрыўджана ды потым абмянялася поглядам з маці Джыма: як я вас разумею. Бацька сумаваў побач, яму таксама хацелася, каб гэтае катаваньне як найхутчэй скончылася, але, праўда, з іншых прычынаў, бацька зьбіраўся яшчэ прабегчыся па блашыным рынку, пашукаць нейкія дэталі для іхнага старога мэрсэдэсу. Непрыкметна вызірнула сонца, і па гандлёвых радох ужо разносілі гарачыя трохпакаёвыя абеды, а яны не прайшлі яшчэ й паловы Абутковага раёну. Джыму невыносна захацелася выйсьці адсюль нарэшце, але ён ня ведаў нават, дзе выхад, бо вакол быў толькі абутак, рабунак, гандаль рабамі, прадаўцы паварочвалі да яго свае тупаносыя, востраносыя, модныя й лакіраваныя пысы з натуральнай скуры, карычневыя, чорныя, белыя, жоўтыя, колеру какавы, плямістыя, з кіслотнымі разводамі, і на мысках распарвалася шво, і мыскі шапялявілі: шамыя нішкія чэны, Турчыя, шкідкі, а ў глыбіні туфляў і чаравікаў пакачваліся туды-сюды, як зьмеі, языкі-сьцелькі, і ў кожнага на канцы сьцякала сьлінай прагнае джала... "Ну няўжо тут няма ніводнае нармальнае палаткі?" – залямантаваў урэшце Джым, ён з надзеяй паглядаў на суседнія кварталы, яму ўжо пачало здавацца, што там ніхто яго ня ведае, і сярод майткаў ды каптуроў можна сабрацца зь сіламі, і вытрываць да канца, і можа быць, недзе на водшыбе, у кутку за платнай прыбіральняй, хаваецца той самы прылавак, на якім акупантусы розных памераў і вагі, але ўсе як на падбор, цяжкія, высокія, замерлыя ў чаканьні гаспадара... Ён крычаў, але ніхто ў горадзе-рынку не зьвяртае ўвагі на крык, а прадаўцы ўсё выхоплівалі яго, і менавіта яго з натоўпу, і глядзелі на яго зьдзекліва: давай, пацан, тата й мама ўжо замарыліся, дай жа ім патраціць кроўна зробленае, ня мучай!". Нібы з дапамогай адмысловага тэлеграфу па Абутковым раёне прабегла вестка: тут швэндаецца хлопчык Дзіма з ускраіны, з продкамі, і продкі шукаюць яму бахілы, прадайце гэтаму дзіцю бахілы, хто прадасьць яму бахілы, таму скідваемся на каньяк! Маці ўсё спынялася каля той ці іншай палаткі, ды тыцкала Джыму ў нос якімі-небудзь рабскімі вырабамі, убогімі як школьная прыбіральня, ні густу, ні стылю... Джым ужо вырашыў здацца ды прымерыў нешта, больш

падобнае да дзьвюх струпянелых жабаў. Маці заўсьміхалася, але потым з трывогай заявіла: “А ты будзеш іх насіць? Ці як у мінулы раз?” Джым зьняў гідоту ды асьцярожна паставіў у кут. Кіслыя усьмешкі, салодкія вочы... Ён круціў галавой ды курчыў такія фізіяноміі, што адна прадавачка не стрымалася й сказала: гэта паскудзтва, так крыўляцца ў такім узросьце, ты бы на сябе паглядзеў... “Капрызныя пайшлі дзеці”, — уздыхнула другая, дакрануўшыся спачувальна да рукі маці, “Ён у нас трохі не ад гэтага сьвету” – пачала маці апраўдвацца. “Але ня паліць і ня п’е”, — маці вырашыла перадыхнуць, і за Джыма ўзяўся бацька: “Што ты як не мужык? Выбірай ды ідзем. Не цягацца ж нам тут да абеду”. “Але гэта ня тое, што я хачу...”. “Хачу, не хачу, ты што, жонку выбіраеш?”.

— Добра, — прамовіла нарэшце маці. – Хадзі ў сваім ашмецьці. Няхай усе гавораць, што я не магу дзіцёнку боты купіць. Ідземце хаця б мінэралкі вып’ем.

Зьнясілены Джым з прыкрасьцю маўчаў. Яны выпілі мінэралкі й пайшлі шукаць выхад: бацька запратэставаў, але маці неўзабаве заткнула яму рот. Ня ведаючы дакладна, дзе стаянка, яны хутка апынуліся ў Цацачным раёне. Вось там, на самай ягонай мяжы, побач з заснулай тэлевізыйнай камбалой, ён і пабачыў запаветную палатку, на вяршыні якой лунаў пірацкі сьцяг. Моўчкі Джым увайшоў туды, ня слухаючы пярэчаньняў. На плястмасавым крэсьле сядзеў у навушніках Сам, паліў ды рамантычна калупаўся ў носе. А перад ім стаялі рыцарскім шыхтом яны, акупантусы, пяць бліскучых пагрозьлівых пар, да якіх было страшна дакрануцца. “Я знайшоў”, — прамармытаў Джым і схаваўся за сьпіны бацькоў.

— Што гэта? – зьбянтэжана спытала маці й выцерла лоб.

— Я такія на заводзе нашу, — патлумачыў бацька. – Бясплатна выдаюць. Хочаш, табе прыцягну?

Сам задуменна зірнуў на бацьку, але нічога не сказаў. Джым набраўся сьмеласьці й, намагаючыся не падымаць галавы, падыйшоў да прылаўку. “Ну і колькі?” – уздыхнуўшы, запытаўся бацька. Сам лянотна працадзіў нешта скрозь зубы.

— Ого, — бацьку ажно скаланула. – Чаго ж так дарага, за што тут плаціць?

Сам паціснуў плячыма ды зноў узяўся за свае ноздры. “Няўжо ты будзеш у іх хадзіць?” – спытала маці незадаволена. “Яны ж па тоне кожны”. Але па твары Джыма было відаць, што ад свайго ён не адступіцца. “Мерай”, — кінуў Сам, не паварочваючы галавы. І Джым

узяў у рукі халодныя, цьвёрдыя акупантусы, якія на ягонай назе адразу ажылі, і не марудзячы сталі прыстасоўвацца да звычак гаспадара, напрыклад, да звычкі без супынку варушыць пальцамі ног, – акупантусы падабраліся, даючы пальцам прастору, добры абутак, выдатны абутак, фантастычны абутак. Праўда, гэтая пара Джыму відавочна была замалая, але большых магло ня быць, і пра нязначны недахоп свайго шчасьця Джым вырашыў бацькам не казаць. “Не запраўляй ты ў іх джынсы”, – жуючы нешта, добразычліва сказаў Сам. “Так іх ня носяць”. “Як гэта не запраўляй,” – падумаў Джым пакрыўджана, – “гэта ж так...”. Але паслухмяна выпрастаў джынсы з акупантусаў, разьлічваючы зрабіць усё так, як хацеў, як толькі апынецца адзін. Бацька паглядзеў на маці, сьцяў вусны ды купіў.

У машыне ён пераабуўся ды патэлефанаваў, як і дамаўляліся, Аляксандры. Бацькі высадзілі яго на праспэкце, акупантусы ім, ён бачыў, былі зусім не да спадобы, але думаць пра гэта бацькі доўга не маглі, сёньня да іх мусіў прыйсьці далёкі сваяк, у якога яны хацелі пазычыць грошы на рамонт кватэры... Амаль шчасьлівы, Джым адчыніў дзьверцу. “Ты хаця б ня позна сёньня?” – маці пагладзіла яго па руцэ, і ён стрымаўся, выцярпеў. Грошай прасіць было няёмка, дый пасьля акупантусаў яму не хацелася пра гэта думаць.

Перш-наперш ён пачакаў, пакуль бацькоўскі мэрсэдэс зьнікне ў плыні машын, потым прысеў на лавачку ды заправіў джынсы, як хацеў. Палюбаваўся на свае ногі ў вітрынах, а ногі не хацелі ісьці паважна-лянотна, ногі несьлі далей, ногі ляцелі, а пальцы балелі, даводзілася іх пастаянна падціскаць пад ступак, і нацёртая пятка хутка засьвярбела, але Джыму было не да гэтых дробязяў. З Аляксандрай яны дамовіліся сустрэцца каля кінатэатру, ёй ад дому датуль было дзесяць хвілін пехатой, яна жыла тут, у цэнтры, і бацькі часта кпілі з Джыма: удала знайшоў нявесту, у прэстыжным раёне, хаця прэстыжныя раёны знаходзіліся хутчэй на ўскраіне, хто ж цяпер захоча жыць у цэнтры, калі машын у горадзе стала больш чым людзей. І сапраўды, калі Джым дакульгаў да кустоў, за якімі хаваліся бэтонныя прыступкі кінатэатру, Аляксандра ужо нэрвова хадзіла туды-сюды й паглядвала на тэлефон.

– Па-першае, выплюнь гэтую сваю цыгарэту, а па-другое, што гэта за страхоцьце ў цябе на нагах?..

З Аляксандрай яму заўсёды было цяжкавата, настрой у яе зьмяняўся ледзь не штохвіліны, заплюшчваць вочы на парушэньні гігіены яна была папросту ня ў стане, але затое заплюшчвала іх

звычайна ў самым натуральным сэньсе ў самы неспрыяльны для гэтага час, яна паліла сама, шмат і зь нейкім вычварэнскім задавальненьнем, але не любіла, калі паліць Джым, яна кпіла зь ягонай музыкі і ў той жа час была непрыхавана закаханая ў аднаго знакамітага рокера, прычым, як здагадваўся Джым, менавіта вопратка гэтага няголенага боўдзілы прываблівала Аляксандру больш за ўсё... Яна была зусім некіраваная, ягоная Аляксандра, але мела тры вартасьці, падзяліцца якімі Джым быў няздольны ані з кім: яна мела загарэлыя грудзі з маленькімі брунатнымі смочкамі, яна ўмела рабіць вамба-вамба як ніякая іншая і ўважліва выслухоўваць усе ягоныя скаргі.

Пасьля таго, як яна так адгукнулася пра ягоныя акупантусы, Джым увесь неяк панікнуў (той няголены боўдзіла, дарэчы, меў амаль такія ж, таму Джым губляўся ў здагадках). Ён стаў у кароткую чаргу па квіткі, якраз пачалася эпоха, калі маладыя людзі зноў пачалі хадзіць у кіно, – але Аляксандра, спахмурнеўшы, ужо спускалася па прыступках уніз. “Ды што з табой?” – ён кінуўся наўздагон ды пайшоў побач, падладжваючыся пад яе крок. “Нічога,” – ня гледзячы на яго прамовіла яна ды ўзяла Джыма пад руку. “Проста”. Яны павярнулі з праспэкту на яе вуліцу. Нешта было ня так, як гэта часта ўжо ў іх бывала, яны йшлі моўчкі, а Джым любаваўся сваімі акупантусамі й разважаў пра тое, у якім ён цяпер становішчы. Як заўсёды, ён казаў нешта нязначнае, і яна адказвала коратка: “так” або “не”, потым ён паспрабаваў іншы, больш дзейсны спосаб, пагаварыць пра яе любімую мыш – гэтая тэма эфэктыўна адбівала ў Аляксандры ахвоту крыўдзіцца, але й тут Джыма чакаў правал. Ён адчуваў, як зьвініць вакол яго паветра, бо ніхто не заглушаў гэтых тонкіх, на мяжы разрыву, гукаў; а Аляксандра крочыла побач у сваім доўгім паліто з крысом як кажанавы крылы, з кароткай стрыжкай, зь вечна незадаволенарухавым носам, і рукі трымала ў кішэнях – знак таго, што сёньня Джыму давядзецца цяжка...

Яе бацькі зьехалі на два дні на поўнач краіны, і Джым шмат чакаў ад гэтых выходных. Чакаў, што яго пакінуць начаваць, чакаў двух сутак цікавага фільму, дзе ён і яна, і сьвет, які будзе глядзець на ягоныя акупантусы, а нікога больш у фільме ня будзе, асабліва бацькоў і прадаўцоў з рынку – зрэшты, ён быў пэўны, што па-за рынкам ніхто яго не пазнае, на гэтых вуліцах і плошчах мэтраполіі... Ці варта казаць, што езьдзіць на рынак з бацькамі ён з таго дня зарокся.

Яны падыйшлі да яе дому, і яна сама адамкнула дзьверы, пазбавіўшы яго ганаровага права, зь якім Джым ужо амаль звыкся, а потым адразу пайшла на кухню ды пачала нешта жаваць. Ён пакорліва прысеў побач і цярпліва чакаў. Яна жавала наўмысна доўга, гледзячы на яго яснымі, сталёвымі вачыма... Маўчаньне станавілася невыносным. Ён раптам убачыў, як па-даросламу яна выглядае, – калі яны пазнаёміліся, Аляксандра была зусім дзяўчом, і толькі гуляла ў дарослую, вопытную, разважлівую... таму ён і пачаў адразу яе так называць, Аляксандра, і ёй, усьмешлівай, з вострымі зубамі, з доўгімі вейкамі, гэта падабалася... Аляксандра...

– Бог з вамі, Аляксандра Міхайлаўна, – сказаў нарэшце Джым. – Годзе вам сердаваць...

Яна выплюнула костачку ў далонь і паволі пайшла да сьметніцы, зусім блізка ад яго. Ён уявіў яе блакітнае сьцягно, дагледжаную скуру, круглае калена... прыцягнуў да сябе, пасадзіў – яна адкінулася на ягоныя грудзі, прымружылася...

– Так нельга, – яна падняла ўказальны палец перад самымі яго вачыма. – Ты пахнеш як парсюк. Ідзі ў ванну, потым пагаворым.

Ён паляжаў у ваньне, усё чакаючы, пакуль яна прасьлізьне да яго, круглы год загарэлыя грудзі, брунатныя смочкі, але потым вада астыла, ён насьпех памыўся й вылез. Апранацца было непрыемна. "Што гэта ў цябе?" – сказала яна, гідліва паказваючы на ягоныя ногі, трохі зьнявечаныя акупантусамі. "Кроў... Вух...". Яна прынесла яму бінт і таямнічы флякон, а сама схапіла цыгарэты й выйшла. Ён знайшоў яе на бальконе – яна сядзела, прысланіўшыся сьпінай да сьцяны, і строга глядзела на двор. "Сёньня субота, транспарт раней сканчае хадзіць..." – прасьпявала Аляксандра. Ён схапіўся за галаву:

– Добра! Можаш лічыць, што мяне ўжо няма...

Джым раздражнёна пачаў зьбірацца, але насамрэч не сьпяшаўся, чакаў. Ніхто да яго не йшоў, і толькі калі ён, мужна трываючы боль, стаў нацягваць акупантусы – яшчэ больш велічныя ды эфэктныя ў сьціплым сьвятле перадпакою – яна стала каля праймаў дзьвярэй – стомленая поза, хітрая ўсьмешка – ды правуркатала:

– І ў гэтых сьнегаходах больш не прыязджай да мяне, добра?..

Ён здагадваўся, што справа ў іх, у акупантусах, ня мог не здагадвацца, яны былі адзіным, што зьмянілася ў ім з учарашняга вечара. Джым задумаўся; адзін акупантус быў ужо на ім, другі стаяў чакальна побач, спакойна пабліскваючы. Выбар – гэта тое,

што мы будзем мець заўсёды. Як ні імкнуўся Джым прымусіць сябе ўзьненавідзець свой новы чароўны абутак, як ні стараўся адшукаць у ім заганы, зрабіць гэтага ён так і ня змог. З другога боку, адмовіцца ад вамба-вамба, калі навокал ніхто болей не выяўляў жаданьня рабіць яму вамба-вамба штотыдзень... “Ты надта доўга думаеш”, — сказала яна расчаравана ды з выглядам чалавека, які нарэшце ўсё зразумеў ды вырашыў, пайшла ў свой пакой, менавіта туды, дзе вамба-вамба адбывалася часьцей за ўсё... “Чорт”, — вылаяўся Джым па-ангельску. “Добра, нашто мне гэтыя сьнегаходы... Я іх брату аддам. Ці басісту падару на дзень нараджэньня. Вось шчасьце будзе ў чалавека...”. Яна не адказвала, і ён пайшоў, лёг побач – яна нібыта спала.

Рашэньне Джыма прайшло выпрабаваньне часам: неўзабаве Аляксандра ўскочыла, поўная энэргіі, як раней, і Джым уздыхнуў з палёгкай. “Ідэя”, — яна села яму на жывот. “Ты ж ня ведаеш, што зь імі рабіць. А я ведаю. Мы аддамо іх таму, хто насамрэч мае ў іх патрэбу”. Ён запытальна ўзьняў бровы. “Гэта ўсё адно ня твой памер, ты ж інвалідам у іх станеш,” – Аляксандра гучна, нэрвова засьмяялася. – “Мы паставім іх на дарозе, тут, пад балконам, і той, каму яны падыйдуць, забярэ іх сабе. Гэта будзе справядліва. Як у дзіцячай казцы.”

Джым быў вымушаны сам выйсьці на вуліцу ў тапачках і паставіць новенькія акупантусы на мокры асфальт. Ён зрабіў гэта зь цяжкай душой, і адзіным, што магло б вярнуць яму цяпер настрой, было добрае, прафесійнае вамба-вамба. Яны зручна ўладкаваліся на бальконе, Аляксандра зрабіла каву. Дзіўным чынам акупантусы не выглядалі на дарозе чымсьці забытым або выкінутым, ніхто не зьвяртаў на іх увагі, іх абыходзілі ці аб’язджалі, быццам боты стаялі там як папераджальны знак. Вось прайшоў школьнік, і акуратна абыйшоў акупантусы, і толькі абярнуўся на іх з адкрытым іртом; потым мажны дзядзька са слоікам разьліўнога піва пераступіў праз іх, глыбока задумаўшыся пра нешта сваё, саракаградуснае; дзьве жанчыны з калясамі аб’ехалі акупантусы, нават не прытармазіўшы, а калі па дарозе прабегла дзіцячая кампанія, якая панура штурхала перад сабой мяч (дванаццаць брудных ног у закасаных да калена трыко), і мяч гэты зьбіў нарэшце правы акупантус, адзін з мальцоў ахайна паставіў яго як належыць. Потым адбылося зусім ужо дзіва: вішнёвыя жыгулі тарганулiся перад самотнай парай акупантусаў і сталі, з машыны вылез маладзён, агледзеў акупантусы, падняў і чамусьці стаў унікліва

вывучаць месца, дзе яны знаходзіліся, потым паставіў іх на месца, і паправіў матузкі, каб ня пэцкаліся, і бачком, бачком, з прыглушаным ровам матору аб'ехаў загадкавую перашкоду.

Такім чынам, чакаць Джыму і Аляксандры давялося даволі доўга. "А яшчэ гавораць, што нашы людзі цягнуць усё, што кепска ляжыць," – сказала Аляксандра, і Джым кіўнуў, хаця ён ведаў: нельга было ні ў якім разе сказаць, што акупантусы дрэнна ляжалі, не, яны стаялі, нерухома й з пачуцьцём уласнае годнасьці, вершнікі, рыцары, ганаровая варта. Аднак надыйшлі прыцемкі, і ў рэшце рэшт да акупантусаў падыйшоў стары сьмярдзючы дзядоклесавічок з торбаю, якому было напляваць на эстэтыку: бязь лішніх думак, нават не азіраючыся па баках, ён падняў акупантусы ды кінуўся ў хмызы, за дом. Джым ледзь стрымліваўся, каб не крыкнуць яму што-небудзь, так крыкнуць, каб зь лесавічка выйшаў увесь ягоны сьмярдзючы прагнілы дух. Але Аляксандра сачыла за рухамі й перамяшчэньнямі дзядка, як за кабылай на скачках, на якую яна паставіла, Аляксандра нават перагнулася праз парэнчы, Джым заплюшчыў вочы й падумаў, што гэта канец.

Вамба-вамба яму ўсё-ткі перапала, перад самым ад'ездам, калі ён, у старых, дачных, але яшчэ цалкам прыстойных туфлях бацькі Аляксандры й горыччу прыкрасьці на вуснах пацалаваў яе на разьвітаньне. Яна абняла яго, шчыра, моцна, нібы захацеўшы прыдушыць, і Джым быў адпушчаны. Да самага прыпынку ён разважаў, а ці нельга было зрабіць так, каб у яго засталася і Аляксандра, і акупантусы, і вамба-вамба, і гэты дзіўны дом, насельнікі якога не кваяцца на чужое дабро, затое сочаць адно за адным з бальконаў... Ні да якой высновы ён так і не прыйшоў, а потым, калі тралейбус вёз ужо Джыма да мэтро, спакойна нешта абдумаць стала праблемай: спачатку за сьпіной расьселася зграя гопнікаў, натуральна, п'яных, і ў той небясьпечнай ступені ап'яненьня, калі сілы такіх жывёлаў прагнуць выхаду; затым невядома адкуль зьявіліся кантралёры, і давялося жаласьліва прасіць не чапаць яго; падумалася пра бацьку, які ўсё ж заплаціў за акупантусы са свайго небагатага заробку, а чаму падумалася? Таму што нядаўна бацька, калі яшчэ быў беспрацоўным, сам ганяў па аўтобусах зайцоў... Падумалася пра акупантусы, ён успомніў, як аддана яны сядзелі на ягоных нагах... У нагах гэтых тым часам вiравала кроў, разбэшчаная нядаўнім вамба-вамба. Потым у тралейбус зайшоў нейкі бомж, відаць, ці бамжыха, Джыму гідка было нават паварочвацца, акупантусы, акупантусы, акупантусы, паўтараў ён бяздум-

на, усё ж можна было абуваць іх, калі ён не плянаваў сустрэчаў з Аляксандраю... можна было, паддаўся, мягкацелы, паддаўся, дурны, асьлеплены, прагны, апантаны...

Ён усё ж азірнуўся, бо сьмярдзела ў тралейбусе так, што станавілася млосна. Каля акна за ягонай сьпінай сядзеў, нахіліўшыся й некаму злосна малячыся, той самы дзядок-лесавічок. На нагах ягоных былі акупантусы, яны выглядвалі з-пад брудных абмотак, запыленыя, залепленыя чымсьці жоўтым, але ўсё яшчэ захоўвалі былую веліч. Лесавічок паглядзеў на Джыма ды замоўк, утаропіўшыся ў вакно. Джым перасеў за сьпіну лесавічка, мімаходзь паглядзеўшы зьверху на ягонае нічым не прыкрытае, апрача клоку сівых валасоў, друзлае цемя, на зморшчаныя карычневыя рукі, што хаваліся між тоўстых, распухлых каленяў. І калі лесавічок, адчуўшы нешта нядобрае, пасьпешліва выйшаў на наступным прыпынку, Джым выскачыў усьлед за ім ды, то трохі адстаючы, то зноў наганяючы спалоханую постаць, пайшоў у бок застылай у тумане й цямрэчы будаўнічай пляцоўкі.

2007, Гамбург

ПАЗАЎЧОРА

Натуральна, яны займаліся гэтым, як жа інакш, за ўвесь той месяц, пакуль яны сустракаліся, яны зрабілі гэта прынамсі дзесяць разоў, калі лічыць першы раз, які, калі напраўду, мог лічыць толькі ён, а яна толькі ўсьміхацца, гэта адбывалася пераважна на ягонай клятчастай канапе, але аднойчы й на кухні, найвузейшай у сьвеце, дзе ў такой позе маглі зьмясьціцца хіба што куры перад адпраўкай у крэматорый, хаця пра які крэматорый мы кажам: у іх нічога ні разу не падгарэла, бо займацца гэтым ім ня тое каб вельмі карцела, проста раз ужо яны сустракаліся, гэта трэба было рабіць, яны й рабілі, прычым ён, вядома ж, меў фору, на якую яна ня надта зьвяртала ўвагу, – натуральна, яны гэтым займаліся, але рэч ня ў гэтым, і давайце пра гэта больш ня будзем, усё насамрэч значна складаней.

Яна была вельмі сучаснай, – ня ў тым сэньсе, што поўзала па падлозе, намагаючыся вызначыць, дзе толькі што высах сьлед моды: яна ставілася да сучаснасьці як да гадзіньніку, на які трэба раз-пораз пазіраць, і гора таму, хто забыўся перавесьці стрэлкі. Яна баялася спазьніцца, баялася праспаць тое, што сучаснасьць часам з такой шчодрасьцю раздае на сваіх перадвыбарчых шоў: мілыя пярэстыя футболкі з надпісам “Today is forever”, эліксыр вечнай маладосьці ў аднаразовых фляконах, карысныя спасылкі, кніжкі, гераіня кожнай зь якіх мае такое ж імя, такія ж праблемы й нават носіць такую ж бялізну, як і чытачка (цудоўнае вынаходніцтва аднаго маладога кампутарнага генія, прыгожы хлопчык, толькі мыецца відавочна рэдка, яна бачыла яго ў нейкім клюбе, дзе геній, як яму й належыць, сумаваў з пакетам чыпсаў). Як і ўсе мы ў свой час, яна баялася атрымаць толькі тое, чаго заслугоўвае, без дадатковых выплатаў і бонусаў. Сучаснасьць празрыста намякала, што жыць у такім узросьце ў адным вымярэньні папросту непрыстойна, і яна ляцела наперад, кожную сэкунду ляцела наперад у сваёй зручнай вопратцы, якую напэўна будуць насіць яшчэ некалькі гадоў... ляцела, не даслухаўшы адказаў, высноваў, прызнаньняў. Сучасна быць здаровай, заўважала мімаходзь сучаснасьць, і таму трэба паліць толькі найлягчэйшыя цыгарэты. Сучасна быць талерантнай, сьпявала сучаснасьць, і таму ты звычайная тупагаловая расістка, калі яшчэ ні разу не пераспала з афрыканцам. Сучасна глядзець элітарнае кіно, строга раз на месяц, і абавязкова на мове арыгіналу, балазе брат кампутарнага генія па-

рупіўся пра квіток для цябе, які ён успрымае адначасова і як квіток у цябе (лепш зрабіць усё самой, так хутчэй, але мы ж дамаўляліся: пра гэта больш ня будзем! — ну яшчэ адзін разок, калі ласка! Добра: сучасна займацца гэтым зь лепшай сяброўкай ды апісваць уражаньні ў сваім жывым дзёньніку, як быццам маеш яшчэ й нейкі мёртвы дзёньнік, але мёртвае ня можа быць сучасным), — і потым пакутліва думаць, што ж сказала тая псыхапатка ў сярэдзіне: адзіная прамоўленая фраза ў дзьвюхгадзінным фільме — і безь перакладу... Сучасна ведаць два словы: хайдэгер і хабермас, што б гэта ня значыла. Сучасна зрабіць сабе пірсінг і тату, калі раптам вельмі захочацца памаляваць. Сучасна слухаць мумумузыку. Сучасна самой зарабляць грошы й траціць іх на мягкія, лагодныя, такія прыемныя ў любое надвор’е, ненавязьлівыя лёгкія наркотыкі (вядома ж, сучаснасьць гэтага ніколі не гаварыла ўголас). Дый брат генія зусім неблагі варыянт, калі падумаць: пры ўсіх сваіх недахопах ён дакладна ведае, што жыве ў (паволі, грудным голасам, плаўна жэстыкулюючы) інфармацыйным соцыюме, грамадзтве спажываньня, тэлебачаньня, высокіх тэхналёгіяў і глямуру. Гэта надзвычай важна: ведаць, дзе жывеш, каб сябры, калі што, выклікалі табе таксі. Толькі вось яна ня была ўпэўненая, што брат генія – гэта больш, чым яна заслугоўвае, мусіў існаваць нехта яшчэ.

Калі яна пачула ўсё вышэйсказанае, ды наконт сваёй, а ня нейкай там іншай, пэрсоны, яна напачатку пакрыўдзілася ды вырашыла пайсьці, але кофта была яшчэ мокрая (не, ні пад які дождж у мэлядраматычнай блізкасьці ад яго дому яны не трапілі, вечар быў сухі ды бяз сонца, і лісьце на дрэвах шаргатала нібы папяровае, — проста мокрая кофта, мы ж дамаўляліся не згадваць болей пра гэта). Таму яна ўздыхнула й засталася. Праўда, пра пірсінг і тату Пазаўчорашні не казаў, ён быццам і ня ведаў, што гэта такое. І пра брата кампутарнага генія яна сама прыдумала. Але астатняе ён усё ж прамовіў, і быў вельмі задаволены. “А свае шкарпэткі ты сам мыеш?” – спытала яна зласьліва й, само сабою, выдыхнула дым яму ў твар, бо вельмі гэта любіла. Высьветлілася, што да яго прыходзіць прачка, і гэта пачынала быць даволі займальным. “Ты маеш на ўвазе сваю маму?” – не здавалася яна. Ён пачасаў лысаватую, коратка стрыжаную галаву, ягоныя босыя ступакі стаялі на белай кашулі, бязьлітасна распасьцёртай на падлозе, і адзін рукаў, які шукаў нешта пад канапай, чамусьці моцна раздражняў Сучасную. Яна паспрабавала разгледзець на ягонай руцэ сьлед ад дзіцячае прышчэпкі, і не змагла. Пазаўчорашні

ўсьміхаўся, ягоныя вусікі ледзь прыкметна рухаліся; дзіўна, што ў яе язык не паварочваўся назваць іх гітлераўскімі ці якімі-небудзь накшталт гэтага, вусікі неверагодным чынам пасавалі Пазаўчорашняму – а сказаць што-небудзь гідкае пра іх так хацелася. Яна адвярнулася й стала вывучаць абстаноўку ў кватэры. Кватэра як кватэра, трэба было быць даволі назіральным чалавекам, каб заўважыць адсутнасьць у ёй звычных хатніх жывёлаў з вадкакрышталічнымі пысамі. Аднак сучаснасьць ня вельмі давярае назіральнасьці, справядліва бачачы ў ёй пагрозу сваім ранішнім вясёлым прабежкам, вось і Сучасная не давярала. Яна спахмурнела й дастала з сумачкі тэлефон, хаця сама ня ведала, што будзе казаць і каму званіць. Пазаўчорашні з ідыёцкай дабрынёй назіраў за яе маніпуляцыямі. Яна набрала некалькі нумароў і ціха вылаялася.

— Ха, дык ён жа чамусьці не прымае сыгналу, — яна падазрона ўтаропілася ў Пазаўчорашняга, які нявінна ды засяроджана распальваў трубку. – Слухай, адкуль у цябе такія плечы?

Яна правяла па іх пазногцямі, стараючыся, каб засталіся палосы. Ён зачмокаў, надзьмуўшы шчокі, і трубка, як маленькі Норд-Экспрэс, менавіта Норд-Экспрэс, а не які-небудзь там дызэль, выпусьціла ў паветра воблачак сапраўднага тытунёвага дыму, з водарам жывое смалы й прыемнай гаркотай. Ёй падабаліся гладкаскурыя загарэлыя мужчыны, і гэты быў якраз з такіх. І яшчэ – добра, што ён так коратка стрыжэцца, можна сабе ўявіць, як бы ён выглядаў з лысінай ды гэтымі неперайнальнымі вусікамі.

— Лаўн-тэніс, — прамовіў Пазаўчорашні амаль горда, пераможна выставіўшы руку з трубкай перад сабой. Паўза была такой доўгай, што Сучасная пасьпела страціць інтарэс да плеч і прахаджвалася цяпер па пакоі, так што яна не адразу ўцяміла, пра што гаворка.

— Чаго-чаго тэніс? – яна прагна ўдыхнула паветра, якое пахла Пазаўчорашнім усё мацней, чыстым целам, радасным пасьля разрадкі; добрым тытунём, лёдам мужчынскае парфумы ды чымсьці яшчэ, незалежным ды спакойным. – А музыка ў цябе ёсьць? Грамафон які-небудзь?

Знаёмыя даўно пераконвалі яе прыйсьці неяк да іх у суботу, калі вузкае заезджанае кола гасьцей яны зьмянялі на больш шырокае, для прафіляктыкі, яна ўрэшце прыйшла, і была надзвычай зьдзіўленая, што ўсе ставяцца з павагаю да маўклівага чалавека гадоў трыццаці пяці ў пінжаку з хлясьцікам, гетрах ды сьмешных панталёнах, які праз адны свае клёўнскія вусікі, здавалася б, мусіў

бы стаць цьвіком праграмы. “О, гэта сапраўдная машына часу,” – шаптала ёй гаспадыня, – “часам бывае карысна пазнаёміцца з такімі бліжэй, добры асьвяжальнік. Кажуць, ён калісьці выклікаў Тарапанскага на дуэль”. Сучасная зацікавілася, яна ўявіла, як Пазаўчорашні забівае кагосьці напавал, і з рулі пісталета ўецца дым, такі самы, як вось цяпер з трубкі; калі б яна змагла пасядзець блізка-блізка, каля самага твару толькі што застрэленага чалавека, яна б нізавошта ня стала яму замінаць, яна б сядзела побач на кукішках ды як зачараваная назірала, як зацягваюцца ледзь бачнай плеўкай вочы й варушацца вусны. Толькі што быў і ўжо няма. Яна падышла да Пазаўчорашняга ды завяла зь ім зьдзеклівую размову пра палітыку, ён ахвотна адказваў, грэючы рукі пад пінжаком. “Вы гаворыце, быццам пішаце, гэта агідна”, – груба сказала яна яму. – “Гэта тупа й нявetліва. Назаўсёды запомніце мае словы.” Потым яны пайшлі пехатою да яго, і вось цяпер мокрая кофта, вымушанае “ты” й гэтае маўчаньне, якое становіцца невыносным.

Спачатку яна думала, што ягоная пазаўчорашнасьць – гэта такая форма сучаснасьці, ці рэакцыя на сучаснасьць. Але сучаснасьцю тут наогул ня пахла.

– Што гэта? – вохнула яна, схіліўшыся над друкавальнай машынкай. – Не, не адказвай, я сама ведаю.

Побач са сталом стаяла музэйная этажэрка, а на ёй былі раскіданыя газэты, прыціснутыя цяжкімі бронзавымі тыграмі, і яна хацела мімаходзь высьветліць, у якім жа часе жыве Пазаўчорашні, калі было гэтае пазаўчора, які парадкавы нумар мае гэтая гульня – але мімаходзь не атрымалася, тыгры ашчэрылі бяззубыя пашчы, Пазаўчорашні быў зануранны ў свой дым, і яна проста адчыніла фортку. На падваконьні ляжаў зашмальцаваны пашпарт, а пад ім яшчэ адзін, усё тыя ж тыгры ды арлы, яна не хацела выяўляць сваю цікавасьць, а спытаць значыла ўключыцца ў яго гульню.

– Неўзабаве я зьеду, бо ёсьць пэўныя справы ў калёніях, – ён усё ж заўважыў, што яна зацікавілася дакумэнтамі. – Я магу ўзяць цябе з сабой.

– На плянтацыі... І натуральна, мы паплывем параходам, – не стрымалася яна й села на падваконьне.

– На жаль, аэрапляны не лятаюць на такія адлегласьці, – адказаў ён зусім сур’ёзна й падняў з падлогі кашулю. – І ў мяне шмат багажу.

Кофта высахла, хаця й пахла цяпер мылам, што было проста жахліва, і Сучасная нецярпліва апранулася.

— Я адвязу цябе, — ён стаяў у дзьвярох вітальні ды зашпільваў гузікі.

— Уяўляю, на чым, — падціснула яна вусны, а потым пашкадавала, гэта было б весела, пракаціцца ў якой-небудзь снопавязалцы. Яна выходзіла зь ягонага стагодзьдзя ў сваё, выў ліфт, зазваніў мабільны, і загадкавая істота, загорнутая ў анучы, поўзала, крэкчучы, па падлозе лесьвічнай пляцоўкі, — Сучасная не адразу зразумела, дзе ў яе галава.

Сапраўды, роўна празь месяц Пазаўчорашні зьнік, перапыніўшы сваім ад'ездам доўгую ды, калі напраўду, надакучлівую чараду сустрэчаў, якія пачыналіся ў несучасных тэатрах, працягваліся ў несучасных рэстарацыях ды сканчаліся ў яго дома, і ад якіх яна даўно зьбіралася адмовіцца, ды неяк не пасьпявала. Прычым яна, паміраючы ад нудоты, усё намагалася скараціць праграму хаця б на першы, самы пакутлівы пункт, бо рэстарацыі прынамсі мелі прыемна несучаснае абслугоўваньне. Але без опэры Пазаўчорашні ня меў апэтыту. І вось ён зьехаў на свае Канары ці ў гэтыя невядомыя калёніі, як сапраўдны імпэрыяліст, і Сучасная нарэшце ўздыхнула з палёгкай. Кампутарны геній усё гэтак жа ня мыўся, і яна, пагаварыўшы з астролягам ды псыхолягам, у адзін па-паліцэйскаму марозны дзень выйшла замуж за ягонага брата. У яе жыцьці нічога нібыта не зьмянілася, але нешта здарылася з сучаснасьцю. Як быццам скончыўся дождж на лецішчы, і на зьмену барабаннаму, пругкаму, неўтаймаванаму грукату кропляў па бляшаным даху прыйшоў мерны, рэдкі, цяжкі постук над галавой...

Праз колькі гадоў яна, так пакуль і не наважыўшыся зацяжарыць, угаварыла мужа зьезьдзіць на тыдзень-два на Адрыятыку. Гатэль апынуўся зусім не такім, як яна сабе яго ўяўляла, — цеснаватым, задушлівым, ды яшчэ даволі далёка ад мора. З надвор'ем ім таксама не пашанцавала, яна толькі тройчы апранала купальнік. Да яе заляцаліся афіцыянты, кожны трохі гаварыў па-расейску, яечна-белы, пыльны гарадок, куды яны прыехалі, выглядаў зь пятага паверху як недавершаны малюнак, рознамоўныя старыя ў шортах ды швэдрах пазіралі на яе з-за шкла з загадкавым інтарэсам, пацягваючы безалькагольныя віктэйлі. Замовілі экскурсію, пасьля якой яна зараклася хадзіць куды-небудзь з гідам. На пяты дзень ёй стала неяк роспачна-сумна й захацелася дамоў. Муж, які ўжо да абеду звычайна пасьпяваў выпіць літр мясцовага віна, драмаў ля басэйну. А яму ж толькі дваццаць сем, разглядвала яна паз-

ногці. А назаўтра раніцай яна выпадкова пабачыла, жуючы вінаград, як ва ўнутраны двор выходзіць Пазаўчорашні ў адных толькі спартовых нагавіцах, ён шпарка скінуў іх і паспрабаваў нагой ваду. Сучасная ледзь стрымалася, каб ня кінуцца яму на шыю. Ён адразу ж пазнаў яе, яны дамовіліся паабедаць разам. Пазаўчорашні прыйшоў у тых жа самых нагавіцах ды кашулі навыпуск, муж Сучаснай падміргнуў ды дастаў бутэльку айчыннай гарэлкі. Сучасная ўсё маўчала ды разглядвала Пазаўчорашняга спадылба, але калі муж выправіўся да басэйну, ня вытрымала.

– А як твой пячорны век? Як параходы?

– Якія параходы?

Пазаўчорашні паглядзеў на яе калені ды зьедліва пасьміхнуўся.

– Слухай, ты што, насамрэч думала, што я буду ўсё жыцьцё гуляцца ў правінцыйнага дэндзі? Ну ты даеш... Та-а-ак, параходы, лаўн-тэніс... Файны быў час.

Ён нечакана зарагатаў, і толькі тады да яе дайшло, што ён п’яны.

– Добры ў цябе супруг... Ты пасядзі тут хвілінку, дамовіліся... А то нешта галава...

Ён цяжка падняўся, памахаў ёй ды пайшоў да басэйну, у якім, заліваючы ўвесь двор вадой і шумна адплёўваючыся, плаваў яе муж, раз-пораз павіскваючы як сьвіньня. З вуснаў Пазаўчорашняга не зьнікала нейкая дурнаватая, жаласьлівая ўсьмешка. Без адзеньня ён, здавалася, выглядаў зусім як калісьці, але тут якраз грымнула сонца, занадта ўладнае ды сьляпучае, каб разгледзець як сьлед усе падрабязнасьці.

Сакавік-красавік 2007, Гамбург

ПАЗБАВІЦЦА АД КАРАЛІНЫ

Цяпер мне ўжо цяжка ўзгадаць, калі ж я ўпершыню намаляваў Караліну. Навек прымерзлая да вобаду сьняжынка, аксамітная пупышка, кветачная экспэдыцыя сонечнага матылька, заштрыхаваны дажджом палы ліст, сьняжынка, пупышка, матылёк – гэтае кола з каляровымі карцінкамі даўно круціцца побач са мной з такой хуткасьцю, што мне застаецца хіба мружыць вочы й прыгладжваць валасы. Калісьці яно рухалася марудна, з музыкай, бы катрынка... Ветрык часу не нясе ні прахалоды, ні цеплыні; шчыра кажучы, я навучыўся не заўважаць ягоных раўнадушных дотыкаў да майго ўспацелага лба.

Затое я памятаю, пры якіх абставінах адбылося яе стварэньне. Незадоўга да гэтага дзядзька знайшоў у мяне фатаграфіі. Некалькі хвілінаў ён моўчкі глядзеў на мяне – дзіўны ягоны позірк, нібы дзядзька падпісаў з кімсьці кантракт, не прачытаўшы да канца дагавору, прымусіў мяне выбегчы з пакою. Увечары за сталом я не падымаў галавы: на талерцы ляжаў парэзаны на кавалкі язык, і ад выгляду сасочкаў на ім мне стала блага. “Я думала, ты любіш...” – расчаравана сказала дзядзькава каханка, узяла самы тоўсты марынаваны памідор, сакавіты й бессаромны, ды шумна ўцягнула ў сябе мякаць. “Эй, ты чаго, плачаш? Не, ты праўда?” Фатаграфій, набытых на вакзале за такія грошы, што жыві я на стыпэндыю, гэтая пакупка выракла б мяне на галодную сьмерць, я болей ня бачыў, ды й дзядзька пра іх ніколі не ўспамінаў. Маіх маленькіх чорна-белых суцяшальніц мне было зусім не шкада, а дзядзьку я быў удзячны – ён паводзіў сябе, быццам нічога не адбылося, так, што неўзабаве я зноў пакепліваў зь ягонай непісьменнасьці, а ён лупіў мяне па галаве крыжаванкай.

Такім чынам, фатаграфіі сталі толькі прыкрым непаразуменьнем, якое засталося без наступстваў, а значыць, яго й не было ўвогуле. Кола яшчэ раз зрабіла поўны абарот, я пасьпяхова перавёўся на другі курс, і ўпэўніўся, што падступны загадкавы ступар, які чамусьці апаноўвае на іспытах-допытах менавіта тых, хто дасканала валодае матэрыялам, болей мне не пагражае. Павага да мяне з боку дзядзькі ўзрасла, здавалася, ужо да неймаверных памераў – мне нават было дазволена не прыбірацца ў сваім пакоі, ягоная каханка рабіла гэта кожны дзень, пакуль я быў ва унівэрсытэце. Рэч у тым, што яны лічылі мяне надзвычай правільным маладым чалавекам, чалавекам, які абраў сабе жыцьцёвы шлях

і йдзе па ім цьвёрдым крокам. Небаракі, яны лічылі, што калі я не ўжываю алькаголю й не палю цыгарэтаў, калі я начую дома й засынаю з кніжкай, то арганізую ім калі-небудзь адпушчэньне грахоў. Вядома ж, адкуль ім было ведаць, што ў ва мне ўжо расла Караліна, хапалася пялёсткамі за стромы край абранага ёй берагу, ведаючы, што ніхто не наступіць на іх разважлівай і абачлівай нагой.

Летам я паехаў да бацькоў, тысячы вольных гадзінаў, якія чакалі юнака ў нашым правінцыйным гарадку, весела зьвінелі ў ва мне, і я марыў пра тое, што патрачу іх з шыкам. Мяне чакаў поўны правал: лета я праспаў ды праеў, і нават загарэць як сьлед ня здолеў. У верасьні я вярнуўся ў свой Бабілён. Дзядзька з каханкаю кожныя выходныя прападалі на лецішчы, а прыязджалі такія стомленыя, што некалькі начэй нават не займаліся каханьнем. Так прайшоў месяц. Неяк яны зноў выправіліся за горад, і ў мяне было амаль два дні, каб падрыхтавацца да першага сэмінару па мангольскім праве. З раніцы я выправіўся ў бібліятэку, схадзіў у кіно, а вяртаючыся ўвечары дахаты трапіў раптам пад несанкцыянаваны дождж, такі злы, нібы ён і праўда быў формай нечага пратэсту. На двары пасьпела сьцямнець, кватэра ўсё яшчэ пахла валяр’янкай, якую выпадкова разьліла раніцай перад парогам дзядзькава каханка. Я з агідай адляпіў ад сябе мокрае адзеньне й хутчэй пачуў, чым пабачыў, як праз адчыненае вакно вада залівае мой пісьмовы стол. Не ўключыўшы сьвятла, я падыйшоў да вакна і ўзяўся за халодную вільготную ручку. Зімны вецер абдаў маё аголенае цела, і так пакрытае гусінай скурай, я кашлянуў, але працягваў стаяць тут. Людзям на вуліцы або ў доме насупраць мяне магло быць відно хіба па пояс, аднак мне было прыемна, што я стаю вось так, адкрыты ўсяму сьвету, п’яны Адам, паміж зубоў якога застрала корка забароненага плоду. Я сеў на падваконьне, зьвесіў ногі ўніз. Па вуліцы сноўдалі парасоны. Я зірнуў на сябе і ўзбудзіўся. Нібы мэдузы ў каламутнай вадзе, пада мной пагойдвалася на прыдоньні гарадзкога мора жыцьцё. Раптам я ўзгадаў пра фатаграфіі, тыя, якія забраў дзядзька, і мне закарцела іх вярнуць. Я залез назад у пакой, зачыніў вакно й пайшоў у спачывальню, дзе спалі гаспадары. Выграб з шафы бялізну дзядзькавай каханкі, лянотна расправіў усе гэтыя майткі й станікі. Мне ніколі не падабалася яе парфума. Уключыў тэлевізар – як на злосьць, на другім канцы зямлі нешта выбухнула, і ўсе тэлеканалы толькі пра гэта й балбаталі. І тады я сеў за свой стол і намаляваў Караліну.

Я намаляваў яе ў поўны рост, простым алоўкам. Яна была

тоўстай – кіляграмаў сто жывое плоці, яна сядзела на плеценым крэсьле анфас, шырока расставіўшы ногі. Юны вычварэнец, я не асабліва клапаціўся пра яе твар, ён атрымаўся зусім схематычным, чатыры грубых рыскі, як расшчэпленыя трэскі. Затое запаветную сэрцавіну я пастараўся зрабіць жывой. Тады я зусім не любіў маляваць, і Караліна была самай непрыгожай з жанчын, якіх я ведаў – аднак мы пражылі зь ёй амаль двое сутак, якія я назваў бы шчасьлівымі, калі б не пачуцьцё няяснай трывогі, якое не пакідала мяне ажно да вяртаньня дзядзькі. Я ледзь пасьпеў зьнішчыць яе: як толькі Караліна была скручаная ў мікраскапічны шарык і адпраўленая ў нетры вадаправоду, у перадпакоі пачуўся званок.

Чаму я назваў яе менавіта гэтак, чаму замест цёплых сьветаў і жанаў мяне напаткала ў гэтай халоднай кватэры, дзе раз на два дні абавязкова гасла сьвятло, Караліна на таннай паперы? Мяркую, справа тут у нізкапробных замежных фільмах, якімі тады была інфікаваная душа ледзь ня кожнага майго суайчынньніка. Мы ўсе мелі тады комплекс уласнае непаўнавартасьці, і марылі ўпотай пра свае будучыя рэінкарнацыі ў джэкаў і джымаў. Нашыя імёны падаваліся нам вартымі хіба шкадобы. Караліна страціла б палову сваёй прыцягальнасьці, набудзь яна славянскае мяно. Што казаць – ды яна б, напэўна, не існавала ўвогуле.

Празь некалькі дзён ружавеючыя дзядзька і ягоная пасія абвясьцілі мне, што сабраліся законна аформіць свае даўнія адносіны. Занятыя мітусьлівымі вясельнымі турботамі, яны перасталі езьдзіць на лецішча, дома цяпер заўжды нехта быў. За ўсю зіму я змог намаляваць Караліну толькі аднойчы. Гэта адбылося ў чытальнай залі бібліятэкі: перада мной сядзела дзяўчына, якую я ведаў у твар, здаецца, яна вучылася на першым курсе, ды і на іншым факультэце. Відаць, яна была блізарукай, бо сядзела, нахіліўшыся да нейкага тому, які ляжаў на яе стале, амаль ушчыльную. Адну нагу яна падагнула пад сябе, джынсы спаўзьлі, адкрыўшы майму погляду салодкую частку яе вабнотаў, спакушальна падзеленую амаль нябачнай палоскай тканіны (тады якраз увайшла ў моду такая бялізна). Прыкрыўшыся вялізнай кнігай, ад утрыманьня якой балелі запясьці, я асадкай пасьпешліва стварыў сваю Караліну. Яна пагардліва глядзела на мяне, мышцы на яе лытках напружваліся, але ссунуць ногі яна была няздольная. Караліна. Я зайшоў за стэляж. “Мы скончаем працу празь пятнаццаць хвілінаў”, — гучна прамовіла бібліятэкарка.

Дзядзька перавез у кватэру сваю маці, яна стала жыць у пра-

хадным пакоі, кожную ноч мяне будзілі яе стогны. Ад Караліны давялося на нейкі час адмовіцца. Адурэлы ад колькасьці вызубранага, я часта клаўся на свой ложак і ўглядаўся ва ўзор на шпалерах: неўзабаве там зьяўлялася Караліна ў загаданай мной позе, хворы яе твар скажала нянавісьць. Так, гэтую, шпалерную Караліну я мог разглядваць да ачмурэньня – але яна прыходзіла не заўсёды. І як бы я ні хацеў, убачыць пад ёй плеценага крэсла я ня мог. А гэта было вельмі істотна, паверце.

Аднойчы дзядзька з маёй цёткай павезьлі старую ў лякарню. Як толькі яны пачалі спускацца па лесьвіцы, я адразу ж выклікаў Караліну. Мы правялі зь ёй пару маўклівых гадзінаў, пакуль я, дашчэнту аглухлы й зьнясілены, не пачуў крокі дзядзькі на кухні. Намацваючы сваю вісячую недзе ў навакольнай пустэчы прытомнасьць, я дрыжачымі рукамі адчыніў вакно й выкінуў Караліну вонкі. Зайшоў дзядзька. “Ты што, курыш?” – запытаўся ён падазрона. “Ты, канешне, як хочаш, але вось я, напрыклад...”. Ён яшчэ доўга размаўляў са мной, а я краем зьніякавелага вока назіраў, як вецер прыклеіў маю Караліну з таго боку вакна да шкла, і яна халодна сочыць сваім адверзлым вокам за тым, што адбываецца ў пакоі. Урэшце дзядзька выйшаў. Вецер хутка зьмяніўся, і Караліну панесла ў стратасфэру.

Музыка грала. Я скончыў унівэрсытэт, паехаў да бацькоў, якія ўставілі мой дыплём у рамку ды павесілі над тэлевізарам. Дома я маляваў Караліну, аднак ці то я зусім згубіў мастацкія здольнасьці, ці то мне ня вельмі хацелася, каб яна пасялілася ў доме, дзе я нарадзіўся – тая Караліна, якую я жадаў, не атрымлівалася. Толькі ўвосень, засохшы ад вымушанага лайдацтва, у мяне нешта выйшла: Караліна стала ладнай, нібы прайшла курс пахудзеньня. А яшчэ падчас аднаго з нашых сэансаў у яе зьявіўся сад – гэта быў сад пры загарадным доме, за высокай агароджаю, каб ніхто не пабачыў оргіяў, якія яна тут арганізоўвала. Потым у садзе загучалі галасы гасьцей – яны таксама сядзелі ў плеценых крэслах, рознага полу, паўтараючы яе позу... Ці любіў я яе? Ці быў закаханы, стаўшы ў адну чаргу да некаторых пэрсанажаў жахлівых літаратурных пэрвэрсіяў? Не, адкажу я, не, усё наадварот – я ненавідзеў Караліну, як толькі ўмее ненавідзець чалавек тых, без каго ён ня можа абысьціся.

Я вярнуўся ў горад, дзе жыў дзядзька, зьняў там пакой у адной сям'і. Прыходзячы пасьля працы, я зачыняўся й займаўся чым хацеў: цяпер я ўжо не зьнішчаў Караліны і яе гасьцей, я набыў

вялікі ліст паперы й намаляваў там свой навязьлівы й прымітыўны сюжэт у фарбах. Захоўвалася Караліна сярод маіх асабістых рэчаў, і ўсё йшло нібыта цудоўна, пакуль не здарылася катастрофа. Я піў з гаспадарамі гарбату, мы мірна глядзелі тэлевізар. Іх дачка гадоў дзесяці сядзела за сталом у белым сачку лямпы й мазюкала нешта ў вучнёўскім сшытку. Гаспадыня зморана паднялася й пашыбавала на кухню. Мімаходзь яна зазірнула праз плячо дзяўчынкі й вохнула. Гаспадар паволі падняўся й пайшоў паглядзець. Ён вылаяўся, выхапіў сшытак з рук дзіцяці й пачаў біць яе па шчаках. Я пабляднеў. "Хто цябе навучыў маляваць такое?" – галасіла маці. Дзяўчынка моўчкі пабегла ў свой кут. Я сядзеў за сталом, калі ў мае дзьверы пагрукалі. "Я вымушаны праверыць", — усё яшчэ ветліва, але пагрозьліва прамовіў гасападар – да ягоных ног ціснулася дачка, зь цікавасьцю паглядваючы на мяне. Што й казаць – яны знайшлі Караліну; я спрабаваў бараніць свае права на недатыкальнасьць, але бацька дзяўчынкі заехаў мне ў зубы і ў той жа вечар выкінуў на вуліцу, забраўшы ўсе грошы – як ён выразіўся, "за маральныя страты".

Я знайшоў другое жытло, аднак цяпер заўсёды браў Караліну з сабою – новую Караліну, бо тая была ганебна зьнішчаная ў мяне на вачах. Мы хадзілі ў парк, і там, паклаўшы на калені спартовую газэту, я наведваў яе сад. У парку мы і сустрэліся з маёй нявестай. Калісьці яна сядзела ў той жа чытальнай залі, што і я, і часам мне здаецца, што менавіта яна была тады перада мной, калі я шаптаўся з маёй Каралінай за стэляжамі. У першую ж ноч яна засталася ў мяне начаваць – балазе, маім новым гаспадарам было напляваць, хто ходзіць да мяне ў пакой, ім навогул усё было да лямпачкі – а празь месяц зацяжарыла. Цяпер яна замінала маім сустрэчам з Каралінай, і тады я стаў пакутліва вырашаць: каго зь іх пакінуць са мной. Як ні дзіўна, зрабіць выбар мне дапамаглі зубы. Адзін зь іх раскрышыўся, я пайшоў да ўрача, і ў прыёмным пакоі зірнуў на сябе ў люстэрка. Маршчына паўзла праз мой лоб, раскрышаны зуб ныў, і статус будучага бацькі лямантуючай істоты, полу якой я нават ня ведаю, пасяляў у душы пачуцьцё безнадзейнага глупства майго існаваньня. І Караліне была наканаваная сьмерць.

Нявеста звольнілася з працы, і нават не выходзіла безь мяне з дому, скардзячыся на тое, што ёй страшна. Агаломшаны ад неабходнасьці ўзвальваць на сябе цяпер яшчэ і чужых прывідаў, я ў разгубленасьці сядзеў у сваёй падатковай інспэкцыі й ня ведаў, што рабіць. І вось момант надарыўся. Усё было проста: я прачнуўся

раней за маю нарачоную, таропка апрануўся й выскачыў на вуліцу з Каралінай пад пахаю. Спачатку я хацеў выкінуць яе ў сьметніцу, але на злосьць усе сьметніцы знаходзіліся якраз у тых месцах, дзе сямігадзінныя людзі, пасьлізгваючыся на першым лёдзе, сьпяшаюцца на працу. Тады я вырашыў спаліць яе, набыў запальнічку й потым да зьнямогі хадзіў коламі па сваім мікрараёне: гэта выклікала б падазрэньні – чалавек, які паліць нешта. Вы ж самі памятаеце тыя часіны: кожны другі сустрэчны на вуліцы – міліцыянт. Усё ж я наважыўся, абраў момант, калі прынамсі на мяне ніхто не глядзеў, паклаў Караліну пад адну з тых лавачак, на якіх з нагамі сядзяць юныя дэбілы, і пасьпешліва пайшоў ў гушчар двароў.

Ён дагнаў мяне амаль каля майго пад’езду, і якой клаунадай мне падалося маё зацярушваньне сьлядоў! “Вы забылі”, — сказаў ён спакойна. “Гэта не маё”, — прамармытаў я. “Я рамантаваў на бальконе сынаў ровар”, — прамовіў ён так, нібы кола ровару было чароўным люстэркам, што паказвае ўсіх злыдняў у радыюсе трох вёрстаў. “Вы памыліліся”, — сказаў я фальшыва і ўцягнуў галаву ў плечы. “Я рамантаваў ровар і падняўся, каб выцерці пот”, — сказаў ён весела й сунуў мне Караліну ў руку. “Я не глядзеў, што там. А вы шпіён...”. Ён зарагатаў, і я скрывіў вусны. “Я чэсны чалавек”. Ён, відавочна, чакаў нейкае ўзнагароды, але я схапіў Караліну й пайшоў прэч.

Праз гадзіну я быў на аўтобусным вакзале. Успацелае й згаладнелае маё цела выйшла на амаль безыменным прыпынку недалёка ад таго месца, дзе тырчыць гарадзкая рыса. Я прайшоў праз поўны чалавечых адкідаў узьлесак, прамачыў ногі, адольваючы бадай што абарончы роў, і неўзабаве апынуўся ў полі, заціснутым паміж могілкамі людзей і пагостам невядомых мне сельскагаспадарчых мэханізмаў. Караліна выпала з маіх рук на сьнег. Я нахіліўся, падняў яе й пасьля некалькіх сутапрговых спробаў запаліў. Караліна гарэла неахвотна, марудна, дымна. Я запальваў яе зноў і зноў, з розных канцоў. Адсырэлая Караліна. Караліна. “Так-так”, — пачуў я раптам каля самага свайго вуха. “Чытаць ня ўмееце... Тут ня тое месца, дзе агонь дарэчы...”. Іх было двое, і хто яго ведае, як яны здолелі падыйсьці да мяне так нячутна. “Дык зіма...”, — жаласьліва прамовіў я. Трохі воддаль ад гэтых дваіх, паблісквaючы на сонцы дзьверцамі, стаяў легкавік. “Паедземце складаць пратакол”, — ласкава сказаў адзін зь іх, а другі прафэсыйным рухам выхапіў у мяне абгарэлую Караліну й сунуў сабе пад паху.

У машыне мне было дазволена трымаць Караліну самому. Мы

шпарка даехалі да гораду, не зважаючы на сьветлафоры пранесьліся празь яго й выехалі на паўночную шашу. Я баяўся пацікавіцца ў маіх спадарожнікаў, куды мы імчым, ды неўзабаве й сам перастаў глядзець у вакно. Мы праехалі не спыняючыся дзень, і другі, і трэці... Прайшоў месяц, і недзе далёка застаўся новы год, і спаленыя чучалы зімы, і купальскія колы ў падробных вёсках, і Караліна спарахнела ў маіх руках, а мы ўсё яшчэ імчым на поўнач, — кола круціцца: сьняжынка, пупышка, матылёк, ліст, — на поўнач, туды, дзе вада, цяжкая як мазут, лепш за нас ведае, што з намі рабіць.

ПАГРОЗА

Ня дайце яму падняцца зь месца!

Позна.

Вось ён выходзіць з тралейбусу, Калтуноў: глядзіць, ці на месцы кашалёк, тэлефон, ключы, супакоена робіць некалькі рашучых крокаў і потым зноў, нібы папярэдняя праверка магла апынуцца падступным сном, спыняецца, устрывожана тыцкае сябе пад рэбры, ляпае па грудзёх, гладзіць маланку на сумцы. На ім скафандр кітайскай вытворчасьці, разьдзьмуты ва ўсе бакі так, што Калтуноў ня бачыць, што ў яго пад нагамі. Да дому, да ягонага пад’езду, над якім і дзень і ноч гарыць рэдкім хваравітым сьвятлом жоўтая лямпа, адсюль ужо зусім недалёка. Прабегчы пад ліхтарнымі сузор’ямі, абагнуць школу й спусьціцца па адпаліраванай санкамі лесьвіцы. Ён нырае ў шалік і мкне наперад між купак бітай ледзяной гонты.

Колькі ён сябе памятаў, яму заўсёды хацелася жыць паблізу ад мэтро. Так блізка, каб вушы не пасьпявалі замерзнуць, пакуль дойдзеш ад пад’езду да станцыі. Аднак у кратовых гульнях, якімі цешыліся апошні час гарадзкія ўлады, для Калтунова месца не знаходзілася. Варта было яму пакінуць бацькоўскі дом, як запаветны пункцір на схемах мэтрапалітэну прарос менавіта там, дзе месьціўся родны мікрараён. Каля цешчынай сталінкі, куды яму давялося перабрацца, зрэдзьчас таксама нешта капалі – але толькі затым, каб выдастаць з-пад зямлі якое-небудзь рэха вайны. А там, дзе яны з жонкай цудам прыдбалі ўрэшце ўласны кут, мэтро сапраўды мусіла неўзабаве зьявіцца – праз паўстагодзьдзя.

(Каля мэтро? – пахмурнела маці. – У свой час мы з тваім бацькам марылі не пра дзе, а пра што! Калтуноў моршчыўся і адным глытком дапіваў гарбату. Такіх, як маці, не пераканаеш. Тыя, хто нарадзіўся ў камуналцы, у высакароднай паваеннай нішчымніцы, да скону будуць загрувашчваць кватэру мэбляй, ратуючыся такім чынам ад страшнага, амаральнага лішку прасторы, хлеб у іх заўжды будзе ўсяму галава, нават дыетычны, а запасу запалак у кладоўцы хопіць да траўня 2045 году.)

Лямпа над пад’ездам вяла адганяла ад сябе цемру. Калтуноў са спадзяваньнем зірнуў на вокны сваёй кватэры й расчаравана затупаў нагамі, абтрасаючы сьнег. Жонкі зноў не было дома, і хаця ён дакладна ведаў, дзе яна і з кім, у Калтунова зьявілася такое адчуваньне, што яго жорстка падманулі. Дарога з працы дахаты

праз увесь горад, зімовы й нявеглы, з трыма перасадкамі, была нялёгкай – ён уяўляў сябе героем-палярнікам, які ледзь не загінуў сярод таросаў, і вось ён дома – а навошта?

Паскардзіцца на сваю закінутасьць ён ня мог. Кватэра была абачліва запраграмаваная на абагаўленьне Калтунова: яшчэ цёплая вячэра ля мікрахвалевай печкі, вымыты посуд, на падлозе ні пылінкі, у лазьніцы сохне ягоная любімая кашуля. Калтуноў з апэтытам паеў, зрабіў сабе каву, падумаў і дадаў туды пару кропляў каньяку, уключыў тэлевізар і стаў глядзець у вакно. Нязгасная лямпа над пад'ездам ледзь даставала сваім сьвятлом да тратуару. У доме на другім баку вуліцы, на першым паверсе, жонка бавіла ягоны, калтуноўскі, вечар.

З музыкантам Лісіцам яна пазнаёмілася ледзь не на наступны дзень пасьля іхных улазінаў. У тое, што жонка яму здраджвае, Калтуноў ня верыў – хутчэй яна задавольвала з гэтым грубаватым і гаваркім вісусам нейкія свае духоўныя інстынкты: такая фармулёўка Калтунову не зусім падабалася, але ў глыбіні душы ён разумеў, што так яно і ёсьць. Спачатку яна пачала забягаць да Лісіцы на чвэрць гадзіны пасьля працы, потым стала траціць на яго выходныя, падкармліваць зь сямейнага стала – то катлет занясе, то кавалак пірагу з разынкамі, то супу ў тэрмасе. Аддала старыя джынсы Калтунова, і куртку джынсавую, яшчэ й бляшанку згушчонкі ў яе загарнула. Паводле словаў жонкі, Лісіца расплочваўся хатнімі канцэртамі, а граў ён непараўнальна – зноў жа такі, Калтунову паслухаць выкананьне генія-самотніка яшчэ не даводзілася. Аднойчы Калтуноў ня вытрымаў, выказаў сваю крыўду, і хаця ні ў чым жонку не падазраваў, дазволіў сабе розныя намёкі... Выслухаў ён у адказ шмат: пра мастацтва, чалавечнасьць і паталягічную рэўнасьць, пра сваю прыземленасьць і абыякавасьць, пра чужую бяду. Жонцы пашанцавала: размова гэтая прыпала на тыя крытычныя дні, калі на Калтунова найшла прыкрая экзыстэнцыяльная ангіна – хто з нас не хварэў на такую – дзякуючы ёй за вырашэньне любой праблемы ён браўся не з таго канца; вось і тады Калтуноў паразважаў да раніцы й прыйшоў да высновы: а й праўда, чаго гэта я? Няўжо стаў настолькі стандартным, што не магу адрозьніць любоў да бліжняга ад пошлага адультэру? Так Лісіца стаў для Калтунова кімсьці кшталту прыёмнага сына.

Бачыць сыночка, аднак, Калтунову зусім не карцела. Жонка пра гэта ведала й Лісіцу прывяла да іх толькі аднойчы, на стары

новы год. Калтуноў назіраў за ім з гідлівай зайздрасьцю. Лісіца то бесьперапынна пазяхаў, паныла пазіраючы на двор, то раптам пальцы ягоныя пачыналі імпэтны бег па нябачных клявішах на кухонным стале, і ногі ў калтуноўскіх тапачках мясілі дыванны ворс. Відавочна, іхны госьць усяго толькі бессаромна гуляў у беднага генія, прынамсі, у той вечар – хто ведае, можа, у сваёй аднапакаёўцы Лісіца выглядаў больш шчырым. Жонка ж старанна ўдавала, што яна таксама чуе тую музыку, якую прынес у адрамантаваную нядаўна кухню Калтуновых аб'ект яе спачуваньня – прынес быццам бы неўпрыкмет, разам са слотай на распухлых чаравіках. Так яны сядзелі й нячутна гралі ў чатыры рукі, а Калтуноў вырашыў: плюну й буду есьці індыка. Ня чуў ён ніякае музыкі. Чуў, як сыгналізацыя спрацавала ў суседавай машыне, як прачнуўся прастылы дух халадзільніку, як радыё мармыча, і патрэсквае сьвечка за віннай бутэлькай. А музыкі не было.

— І ўсё ж вы, журналюгі, толькі абслуга, — казаў Лісіца праз паўгадзіны, жуючы мяса Калтунова. – Нельга вас называць творчымі людзьмі. Нехта грамадзян чабурэкамі корміць, нехта ў пральнях працуе, нехта інфармацыяй забясьпечвае. Бытавое абслугоўваньне.

Калтуноў тут жа пакрыўдзіўся; ён ужо даўно ўпотай занатоўваў тое-сёе, марыў раман напісаць. Не цяпер, вядома, а гадоў так празь дзесяць. Жонка заўважыла, абвілася вакол шыі, лізнула мімаходзь у вуха. "Толькі дзеля яе", — зьмірыўся Калтуноў і выціснуў зь сябе:

— А вы чым на хлеб зарабляеце, дазвольце пацікавіцца?

Чамусьці ён з самага пачатку размовы зь Лісіцам ўзяў такі тон, і ня ведаў, як яго зьмяніць.

— Гофман вось падзяляў усіх людзей на музыкантаў і немузыкантаў, — таямніча прамовіў Лісіца, накладаючы сабе капусты Калтунова, й потым дабрадушна засьмяяўся. – Ну, ведаеце, у чэргах па месца ў тралейбусе раніцай не стаю. Дзесяць верных слуг... Мае пальцы не даюць мне памерці з голаду.

Жонка паглядзела на пальцы Лісіцы й ледзь прыкметна пасьміхнулася. Калтуноў кісла хітнуў галавой. Вечар ніяк не хацеў сканчацца.

— Гэтая ваша нязгасная лямпа – проста лухта, — насьмешліва казаў Лісіца, дапіваючы віно. – Я вось ведаў адну цётку – дык у яе электралічыльнік круціўся ў адваротны бок. Уяўляеце, колькі вінен ёй энэрганагляд!

Жонка апранулася праводзіць Лісіцу, яны хацелі яшчэ паза-

баўляцца каля школы з пэтардамі, выпіць шампанскага на марозе – звалі з сабой і Калтунова, але ён пайшоў спаць. "Божа мой, як гэты Ліска мне надакучыў", – пазяхнула жонка, вярнуўшыся, і сонны Калтуноў са зласьлівай радасьцю закашляўся. А назаўтра ён зноў бавіў вечар у адзіноце.

Прыгадваючы ўсё гэта, Калтуноў так расхваляваўся, што пайшоў да шафы па цыгарэты. Яны з жонкаю дазвалялі сабе зрэдку такое задавальненьне. Адчыніў фортку, запаліў і няўмела скінуў попел у кафейную гушчу. Вакно Лісіцы пагасла й тут жа сьвятло ў ім запалілася зноў.

Потым быў яшчэ візыт у адказ. Калтуноў шчыра ўразіўся, наколькі бедна жыў жончын навязьлівы сябра. У Лісіцы не было нават пліты. "Як жа вы..." – зьдзіўлена выцягнуў шыю Калтуноў, а Лісіца махнуў стомлена рукой: "Я дома рэдка харчуюся... А калі што, у суседкі кіпню можна ўзяць і – магі, магі".

– А дзе ж ваш інструмэнт?

Лісіца нехаця сьцягнуў з чагосьці, што падавалася Калтунову вялікім пацертым камодам, ворах анучаў. Падняў накрыўку, ускудлачыў клявішы – чорна-белы рад мільгануў і зьнік.

– Няма настрою. Тут у мяне мускат, сыр...

Калтуноў роспачна слухаў, як заміраюць незнаёмыя гукі. Магчыма, гэта было паведамленьне, паведамленьне на музычнай мове для яго, Калтунова, кароткі зьдзеклівы тэкст. Ён павярнуўся да жонкі. Тая наразала сыр, падняла галаву, зірнула на яго зь вясёлым пытаньнем у вачох.

А была ж яшчэ трэцяя сустрэча. Трохі п'янаваты (у рэдактара быў дзень нараджэньня), Калтуноў бег дахаты па сваім звычным вячэрнім маршруце, і каля школы, там, дзе за кустом арэшніку, як пэрыскоп субмарыны, тырчаў проста са сьнегу іржавы кран, спаткаў Лісіцу, які хадою касманаўта адольваў ледзяную дарожку.

– Жывым вы мне падабаліся больш, – сказаў Лісіца замест прывітаньня. Калтуноў спыніўся й з выклікам прамовіў:

– Нам трэба пагаварыць.

– Што вы сказалі? Вы бурчыце ў ваш тоўсты шалік, і словы заблытваюцца ў нітках.

Балянсуючы на лёдзе й раз-пораз хапаючыся адно за аднаго, каб захаваць раўнавагу, яны пачалі высьвятляць адносіны. Калтуноў імкнуўся трымаць сябе з годнасьцю, але неўзабаве ўжо крычаў, і рэха білася ва ўнутраным двары школы, нібы там, у поўнай

цемрадзі, праводзілі лінейку. Цішэй, цішэй – Лісіца, не падымаючы пакуль пальчаткі, адно падносіў палец да ўсьмешлівых тонкіх вуснаў, Калтуноў выбачаўся зьбянтэжаным шэптам і потым лямантаваў зноў. Ён абрынаў на Лісіцу белыя касмылі пары і абвінавачаньняў, а той маўчаў, і толькі ногі ягоныя нэрвова езьдзілі па шэрым лёдзе.

А калі пара ў роце Калтунова скончылася, Лісіца ўздыхнуў і нягучна пачаў сваю адповедзь. Гэты прайдзісьвет думаў адбрахацца дурнымі сваімі жартачкамі, а калі Калтуноў падступіў бліжэй, стаў несьці ўжо поўную лухту. І раптам, па маркотным зялёным агеньчыку ў вачох Лісіцы, па брыдоцьці, якое той таропка прамаўляў, быццам сьпяшаючыся як найхутчэй схавацца за нагрувашчаньнямі неімаверных нейкіх, няісных у прыродзе рэчаў, Калтуноў ясна ўсьвядоміў: ён меў рацыю, і роля падманутага мужа яму не пагражае. Як бы Лісіцу гэтага не хацелася.

Ён загасіў цыгарэту, прайшоў у спальню, распрануўся й лёг. Уключыў тэлевізар. Сон адразу ж наваліўся на Калтунова, задушыў Калтунова, пасадзіў яму на павекі белых птахаў, пахаваў яго між гарадзкое мерзлаты... Калтуноў пабачыў сябе пад агромністым сталом, зь якога на мягкі дыван марудна падаюць шматкі гарачага попелу – апускаюцца на ворс, буйныя, шэрыя, несучы з сабой ружовую памяць агню... Дыван успыхвае, і кватэра напаўняецца дымам. Калтуноў бегае пад сталом, па ножках якога ўжо караскаецца полымя, Калтуноў крычыць штомоцы, аднак ніхто яго ня чуе. А ці праўда, ці затушыў ён цыгарэту?

Ён усё ж выдзер сябе са сну. На экране й праўда нехта крычаў – гэта й дапамагло яму прачнуцца. Калтуноў кінуўся стрымгалоў на кухню, што непрыемна пахла тытунём. Трупік недапалку паволі пагружаўся ў багну недапітае кавы. Калтуноў адчыніў фортку й выплеснуў зьмесьціва кубку ў сьнег.

Некалькі дзён таму Лісіца захварэў – нічога дзіўнага, ён ня меў нават зімовага абутку, пакуль жонка не аднесла ў майстэрню старыя калтуновы вунты, якія там за падвоеную плату рэанімавалі яшчэ на адзін сэзон. Наступным ранкам, перад працаю, Калтунову давялося ісьці ў аптэку – наўрад ці б ён зрабіў гэта, але калі а сёмай раніцы жонка абыходзіцца з табой так пяшчотна – з табой, з табой, якога яна бачыць кожны дзень ужо восем гадоў і восем месяцаў, з табой, які ўвечары засынае адразу ж, як толькі прыме гарызантальнае становішча, з табой, які... Лісіцу, па аповедах жонкі, сапраўды добра скруціла: даводзілася нават выклікаць хуткую.

Калтуноў узгадаў, як учора, калі ён апранаўся на працу, жонка сказала яму, расчэсваючыся ў ванным пакоі:

— Ведаеш, я ўчора... Ён нарэшце заснуў, і мне – я якраз сядзела каля ўзгалоўя... мне падалося...

— Што?

— Ягоныя пальцы варушыліся, быццам ён... Быццам ён граў у гэты момант. Цікава, што за музыку ён чуў?

Калтуноў з палёгкай высмаркаўся, апынуўшыся ў сваім скафандры. Ён напнуў на галаву мехавы капялюш і зазірнуў у лазьніцу:

— А калі я буду валяцца з тэмпэратурай пад сорак, ты будзеш сядзець каля майго ўзгалоўя?

Яна абярнулася й выцягнула ўмольна рукі:

— Ну што ты такое гаворыш! Буду! Буду! І каля твайго, і каля Кацькінага, і каля бацькавага, і каля Міхаіла Пятровіча буду! Бо калі ў маіх сілах палегчыць...

У вачах жонкі бліснулі доўгачаканыя сьлёзы:

— Ён жа ў гэтым горадзе абсалютна адзін...

Калтуноў пацалаваў яе й пайшоў на працу.

Каля ўзгалоўя. Узгалоўе. Коўдра. Ложак. Падушка. Праз хвіліну ён ужо спаў, трымаючы руку паміж ног, у той позе, у якой чакаюць свайго зьяўленьня на сьвет усе зародышы сьвету, ад чалавечых да рыбіных.

Назаўтра ён доўга ня мог падняцца, быццам яго трымалі схаваныя пад прасьцінай нечыя белыя цёплыя лапы, — і таму ад сьняданку давялося адмовіцца. Калтуноў сьпешна сабраўся й цалкам мог бы пасьпець на працу, калі б не заўсёдныя яго ранішнія страхі. У пачатку кожнага працоўнага дня яны адымалі ў Калтунова даволі шмат часу: яму ўсё здавалася, што ён забыў выключыць газ, і Калтуноў, аж пакуль у яго не пачыналі балець вочы, усё вяртаўся й вяртаўся на кухню, ужо абуты, і ўзіраўся ў праклятыя ўключальнікі на пліце. Калі ж наважваўся нарэшце пераступіць парог, і тады страх даставаў да яго, ужо пакідаючага кватэру – зь незвычайнай выразнасьцю ён уяўляў жонку, якая бесклапотна сьпіць, пакуль паветра вакол яе напаўняецца нябачнай і страшнай атрутай, і Калтуноў адмыкаў дзьверы, вяртаўся й наноў упіваўся вачыма ў шэраг бяскрыўдных на выгляд колцаў, кропачкі на якіх, здавалася, толькі й чакаюць, каб падскочыць уверх адразу пасьля сыходу Калтунова.

Якімі ж лёгкімі былі раніцы, калі жонка прачыналася разам зь ім! Ня трэба было траціць час на задаволеньне ўсіх гэтых фобіяў. Аднак часьцей за ўсё жонка яшчэ спала. Вось і сёньня гадзіньнік паказваў ужо восем, калі Калтуноў, мысьленна ўжо плачучы на жончыных хаўтурах, выйшаў на мароз, пад сьвятло нязгаснае лямпы.

— А й праўда, дзе ж яна выключаецца? – падумаў ён сонна, узьбіраючыся на ўзгорак да школы. Яго чакаў працяг ранішніх кашмараў – тралейбусны прыпынак. Камунальныя рогі гэтых пачвараў ужо гайдаліся ўнізе ў прадчуваньні Калтунова, ужо ляскалі іхныя прагныя сківіцы... Калтуноў абагнуў школу й пабачыў яшчэ адзін небясьпечны недагляд. З жалезнага крану, які тырчаў убаку ад дарожкі, за прутамі замерзлага арэшніку, біў тонкі струмень гарачай вады. Яна лілася ў сьнег, паступова ўтвараючы пад кранам шырокую ледзяную шапку, празрысты блін з маленькім вірам кіпню пасярэдзіне. Калтуноў, зачараваны выглядам крану, спачатку прайшоў міма, але потым вярнуўся й паспрабаваў закруціць яго. Рукі ў пальчатках сасьлізгвалі ўніз, і неўзабаве ледзь ня трапілі пад струмень. Ён зьняў пальчаткі. Уключальнікі пліты стаялі ў Калтунова перад вачыма. Люты холад, які, аднак, пасадысцку абяцаў пякучую вечную цеплыню праз пару хвілінаў – толькі пацярпі! – працяў далоні. Калі кран і паддаўся, то хіба на некалькі сантымэтраў. Калтуноў удыхнуў пах гарачае вады й рушыў да прыпынку.

— Сёньня ноччу яна сказала, што яму лепей, — падзяліўся ён з Косьцем, калегам, які быў у курсе Калтуноўскіх праблемаў, у сталовай НДІ, дзе яны часам абедалі. Паверхам вышэй рэдакцыя арандавала тут памяшканьне.

— Каму?

— Ну гэтаму, музыканту. Прыйшла апоўначы, легла як ні ў чым ні бывала. Булён, сказала, учора еў, — Калтуноў усьміхнуўся й задуменна дажаваў сасіску. – Упершыню за тры дні.

— Дзяцей вам трэба завесьці, — сказала раптам Башмакова з аддзелу рэкламы. Калтуноў зьдзіўлена падняў на яе вочы. – Ёй проста хочацца даглядаць каго-небудзь, хочацца, каб быў нехта капрызны й шумлівы, за кім трэба... А ў цябе занадта мала патрэбаў. Дзеці, толькі дзеці.

Калтуноў зьдзіўлена зірнуў на Косьцю, але той апусьціў вочы й схапіў паднос. “Дзяцей!”, — крыкнула ім усьлед Башмакова й пераможна агледзела павернутыя да яе галовы.

Жонка патэлефанавала пасьля абеду – Калтуноў ужо рыхтаваўся паставіць кропку й вісеў над клявіятурай, раздумваючы, ці не запусьціць усё ж пару крытычных стрэлаў. Яму зноў стала горш, сказала яна і потым, нібы просячы прабачэньня, дадала: я пасяджу сёньня ў яго да раніцы, добра? Ён зарохкаў нешта няўцямнае; на экране, за чорнымі радкамі, што вылезьлі з Калтунова за некалькі пасьляабедзенных гадзін, яму бачыўся кран у рудой лусцы іржы, і вада лілася ў сьнег, бы мача. У слухаўцы пачуліся гудкі. Ён доўга замыкаў дзьверы, зноў і зноў правяраючы, ці блішчыць у шчыліне палоска мэталёвага язычку.

Ідучы каля школы, ён на гэты раз вырашыў не глядзець у бок кустоўя, аднак нехта выгукнуў зь цемры, менавіта адтуль, дзе ён сёньня а восьмай рабіў ранішнюю гімнастыку: “Малады чалавек, дапамажыце!”. Калтуноў паскорыў хаду, але яго пазвалі зноў.

Каля крану стаяў, разьвёўшы рукі ў ненатуральна вялікіх рукавіцах, дзядок з тых, якія вечна лезуць не ў свае справы. “Што робіцца, га?” Налягаючы ўсім целам, Калтуноў пад мацюканьні дзядка зноў паспрабаваў закруціць кран, і прамачыў-такі нагавіцы, так што да пад’езду ён падыходзіў зь ледзяной коркай на каленях. Перад тым, як легчы спаць, ён сунуў у сумку гаечны ключ.

Жонка прыйшла, калі Калтуноў абуваўся – пад вачыма чорна, на галаве абы-што, нейкая хустка. “Я ня ведаю, што рабіць”, — яна таропка пацалавала яго й зморана пашыбавала на кухню. “Я яму кажу: табе ў лякарню трэба, а ён ні ў якую. Давядзецца адпрасіцца сёньня з працы”. Калтуноў моўчкі выйшаў за дзьверы.

На гэты раз ён абыйшоў школу з другога боку й такім чынам змог падкрасьціся да крану ззаду. Хвілінаў праз дваццаць яму ўдалося закруціць кран амаль напалову; нейкая настаўніца, ідучы па замерзлай сьцежцы да школьнага ганку, ухвальна крыкнула яму: “Даўно б так!”. Струмень і праўда біў ужо не з такой сілай. Успацелы Калтуноў схаваў гаечны ключ у сумку й пабег да прыпынку, ён адчуваў неймаверны ўздым. Тралейбус быў паўпусты, мэтро падалося прасторней – Калтуноў спазьніўся на працу больш чым на паўтары гадзіны. У калідоры ён наткнуўся на рэдактара, і той нават не павітаўся з Калтуновым.

Увечары дома ён знайшоў на стале цыдулку ад жонкі. “Прыязджала Кацька. Ліска ў лякарні. Я павезла яму рэчы. Пяльмені ў лядоўні. P. S. Там напісана, як гатаваць”. Калтуноў доўга стаяў пад душам, яму ўсё здавалася, што вада недастаткова гарачая, і ён усё нахіляўся й нахіляўся да крану, аж пакуль не адчуў, што яшчэ

хутка, і ён зварыцца зажыва. У пэўны момант ён пачуў, што нехта звоніць у дзьверы, але вылазіць з-пад душа, як з-пад цёплае коўдры, яму не хацелася. Потым ён загарнуўся ў халат, выпіў каньяку й ледзь не заснуў на кухні.

На наступны дзень кран абараняўся ад Калтунова больш удала. У пэўны момант Калтуноў нават падумаў адмовіцца ад змаганьня і амаль з роспаччу схапіўся за ключ, перад тым як пайсьці да прыпынку. Аднак наляцелы зьнянацку вецер, які павярнуў струменьчык акурат на абутак Калтунова, прымусіў яго напасьледак яшчэ раз як сьлед напружыць сілы, і пару міліметраў ён выйграў. Жонка патэлефанавала яму на працу – яна вырашыла, пакуль Лісіца ў лякарні, пажыць у Кацькі – адтуль да абласной было два кварталы. Калтуноў зь дзіўным спакоем выслухаў вынікі аналізаў – яны, на жаль, пакуль не ўнушалі асаблівага аптымізму – і, перадаўшы Кацьцы прывітаньне, паклаў слухаўку.

Назаўтра, па звычцы сем разоў пералічыўшы ўключальнікі на пліце, Калтуноў пабег да крану. Мароз прыкметна саслабеў, сьнег стаў ломкі, як шакаляд, але ўсё ж Калтуноў некалькі разоў пасьлізнуўся, перад тым як апынуцца ля кустоўя. Да турніку на школьным стадыёне былі прыслоненыя лыжы, побач нарэзваў колы нейкі бамбіза. Працуючы па чарзе, яны дасягнулі таго, што вада цяпер толькі крапала з крану. Увечары занепакоены Калтуноў двойчы хадзіў да школы праверыць, ці не давядзецца заўтра пачынаць усё спачатку. Але з крану, з прыемным і прыймальным інтэрвалам, падалі на падталы, раскіслы лёд такія ж цяжкія кроплі.

Раніцай у пад’езьдзе ён сустрэў суседа. Той быў відавочна ўзрадаваны тым, што да прыпынку яны пойдуць разам, пачаў нешта распавядаць пра сваю новую машыну. Спыніўшыся пад лямпаю, Калтуноў разьвітаўся зь ім і пакрочыў па вуліцы ўніз. Дачакаўшыся, пакуль расчараваны сусед адолее слотныя прыступкі, Калтуноў шпарка пайшоў уздоўж школы й пастаяў трохі, укрыўшыся за яе доўгай сьцяной. Дзеці зь цікаўнасьцю глядзелі на яго ў вакно, і маладая настаўніца раздражнёна завесіла фіранкі. Калтуноў паволі падыйшоў да крану й скінуў скафандр. Лёд амаль растаў, і пад ім агалілася выспа бруднай, бурай травы, у яую падалі каламутныя кроплі. Ён прымружыў вочы, пастаяў крыху, й потым узяўся аберуч за вэнтыль і павярнуў яго. Неймаверная палёгка агарнула Калтунова, і падхапіла Калтунова, і шпурнула яго кудысьці ўбок, і падняла над вуліцай, над усім тым рухомым, рухавым, няспынным і шумным, цеплакроўным і вібруючым, што няўхільна пасоўвалася ў накірунку мэтро.

АБСАЛЮТНЫ СЛЫХ

На мэдыцынскай лаціне ён называецца tragus – абцягнуты скурай храшчык, дэкаратыўны вартавы каля ўваходу ў пячору чалавечага вуха, туды, дзе зьдзяйсьняе сваю ўрачыстую працу самая дзіўная з існых на сьвеце кавальняў. Амаль бескарысны, амаль атавізм, часам нават зусім непрыкметны, ён тым ня менш яшчэ скарыстоўваецца некаторымі з нас дзеля пэўных мэтаў; з абсалютным падабенствам паўтораны ў невідочнай блізкасьці ад свайго пасту, задуманы хутчэй з аглядкай на непадатлівую пустэльню, чым на заўжды гатовыя да кампрамісу цесныя гарады ў люстэрку задняга агляду; кропля барбарства ў барочнай ракавіне вонкавага вуха – трагус. На яго можна націснуць пальцам, прыцішыўшы навакольны сьвет, пазбавіўшы яго на нейкі час стэрэагучаньня – а можна націснуць адначасова на абодва свае трагусы – а можна ганяць свае трагусы туды-сюды, то прыбіраючы пальцы, то зноў тыцкаючы імі ў вушы, прымушаючы вуліцу мярзотна квакаць, ператвараючы ўсё ў анэкдот, у сьмехатуры, у бязглуздую гульню.

Вось і я, наіўны, напружана цісну цяпер на абодва свае трагусы, спрабуючы хаця б на хвіліну выключыць гэты нясьцерпны крык за сьцяной. Цісну, забыўшы, што аднойчы пачутае можа стаяць увушшу яшчэ доўгія гады. Бо трагус – бутафорскі жаўнер, ён адразу ж забываецца на тых прыхадняў з катавальнымі прыладамі, што прасьлізнулі міма. І лямант, які чуецца з-за сьцяны, разьдзірае мяне знутры. А я цісну й цісну на трагусы, ажно пакуль яны не пачынаюць балюча сьвярбець – і ўсё адно з гулкай ратавальнай ваты пакрысе высоўваецца зьняможаная пыса жахлівага крыку.

Седзячы вось так за сталом і трымаючы сваю цяжкую галаву ў руках, нібы баскетбольны мяч перад тым, як кінуць яго ў карзіну, я не адразу разумею, што мне гаворыць Альбінос на гэты раз: ягоны твар падплывае да мяне збоку, нахілены амаль да майго носу; вусны Альбіноса варушацца, і ўсьмешка на іх, гэтае агіднае аднаклетачнае, паволі скарачаецца:

– Што? – я пасьпешліва перахопліваю ў яго двухкроп’е: Што? Я болей не магу! Я зараз памру! Скажы ім, каб яны спыніліся! Прашу цябе! Скажы ім!

Я адымаю пальцы ад скроняў. На колькі імгненьняў стала ціха, нібы адмыслова для таго, каб даць мне прамовіць гэтыя прыніжальныя словы. Аднак як толькі я замоўк, енк за сьцяною распачаўся з новай сілай. Альбінос пасьміхаецца й садзіцца перада мной

на крэсла, налягае грудзьмі на сьпінку, кладзе на яе рукі, глядзіць на мяне пяшчотна-зьдзекліва; ён ня мае броваў.

— Няўжо чуваць? Я ўжо думаў, ты аглух. Так заціскаў вушы, я думаў, і дзірак не застанецца – зарастуць, рассмокчуцца вухі!

Сьмех у Альбіноса хрусткі, сухі – з такім гукам камечаць новы, пусты цэляфанавы пакет. Ён закатвае чырванаватыя вочкі й тупае нагой ад задавальненьня, у такт крыкам з суседняга пакоя. На Альбіносе майка-барцоўка й сінія шорты, такія шырокія, што паміж ног, калі ён садзіцца,надзімаецца сапраўдны шар. О, за той час, які мы прабавілі разам, я пасьпеў добра вывучыць ягоную зьнешнасьць вечнага хлопчыка, пах ягонае дарагое парфумы ўеўся ў кожную складку майго сьціплага гардэробу, звыкся з тым, што ён почасту шчыпае сябе за левы сасок, размаўляючы па тэлефоне, я пасьпеў узьненавідзець ягонае цела без усялякіх прыкметаў расьліннасьці – у адной маёй наздры больш валасоў. “Няўдачнік”, — кажа Альбінос ласкава й торгае мяне за мочку вуха, пакуль я – з трэцяй спробы – не затыкаю сваімі трагусамі закатаваныя слыхавыя каналы. Гэта дае прынамсі ілюзію таго, што я нічога ня чую.

Няўдачнік. Гэта праўда, мне ніколі не шанцавала. Гэта праўда (неўтаймаваны крык) што мне (гайдаецца) ніколі (паміж маіх) не шанцавала (трагусаў) гэта праўда (як акрабат) што мне (пад купалам цырку) ніколі (на трапэцыі) не шанцавала (рытмічна стукаючыся ў чарапную каробку). Я нават рады, што не ажаніўся, што не займеў дзяцей, што згубіў сяброў, аднаго за адным, нібыта ў душы маёй зеўрыць дзірка, куды яны з зайздроснай паступовасьцю правальваліся – рады, бо цень майго фатальнага нешанцаваньня несумненна закрануў бы і іх, а так кепска толькі мне, падарожніку на пыльным прасёлку – іншыя выправіліся чыгункай. Апагей жа майго нешанцаваньня прыпаў на той дзень, калі мы стаялі баязьлівым натоўпам там, унізе, ля ганку – брудна-брунатыя статуі ў тонкіх сарочках сьнегу, каля якіх мы тады абменьваліся грубымі жартачкамі, я магу пабачыць і цяпер, варта толькі прыўстаць з-за стала і адсунуць фіранку. Альбінос прыбыў ці не з самай апошняй партыяй, на ім былі тыя ж шорты й майка. Ён паводзіў сябе так бесцырымонна, што наша купа сьціхла: кожны баяўся атрымаць яго суседам. А я, як толькі пабачыў, зараз жа зразумеў: мне трапіцца менавіта Альбінос. “Ты чаго вылупіўся?” – кінуў ён мне, калі пачаўся падзел на пары. А я ня мог адвесьці позірку ад ягоных чырвоных, як на фатаграфіях, зрэнак.

— Скажы ім! Ну скажы ж ім! Няхай яны перастануць! Гэта невыносна!

— Невыносна? – Альбінос пацiскае плячыма. – Я б не сказаў. Зрэшты, ты ж можаш выйсьці з пакою. Ніхто цябе не трымае.

Я бясьсільна й ціха выю, загортваючы кнігу. Крыкі працягваюцца, пранізьлівыя, пакутныя. Нават у гэты момант мне прыкра ад таго, што я зноў забыў закласьці старонку – давядзецца потым шукаць, а старонкі ж непранумараваныя, некалькі тысяч старонак таўшчэзнай кнігі. Застаецца толькі, як заўсёды, узважваць на далоні паперу, каб хаця б прыкладна вызначыць месцазнаходжаньне тых словаў, на якіх я спыніўся. Складаны занятак, які да ўсяго вымагае засяроджанасьці, а яе амаль немагчыма дасягнуць у пакоі, за сьцяной якога нехта так роспачна лямантуе. Я ўяўляю сябе сьпінай, аголенай сьпінай, якую бязьлітасна паласуе аўтаматычная пуга. Раптам Альбінос падымаецца з крэсла – адно затым, каб сарваць гронку вінаграду над ложкам.

— Хочаш? – ён запытальна глядзіць на мяне. – Ну, як хочаш. Не, мне таксама больш да спадобы чорны, але ж выбіраць не даводзіцца, праўда?

Ён адкрывае рот, і мне падаецца, ягады самі саскокваюць яму між зубоў. Я кладу галаву на кнігу.

Ужо ў першы вечар нашага знаходжаньня тут высьветлілася, што болей за ўсё Альбінос любіць гуляць і перамагаць. Я быў надзвычай зьдзіўлены, калі гэтая каржакаватая істота раптам выдастала зь невялікага чамадану безьліч розных пці-жо, як іх называлі калісьці: там былі маленькія дарожныя шахматы на магнітах і гэткія ж шашкі, там былі нарды й го, парнаграфічныя карты й гульня “Загані шарык”, тамагочы й даміно, дроцікі з наборам мішэняў, розныя дзіцячыя забаўлянкі накшталт “Аўтагонак” і цэлы пакецік гуляльных касьцей, настольны футбол і нават плястмасавы рэвальвэр з шасьцю кулямі. Што казаць: жадаючы, каб Альбінос як найхутчэй ад мяне адчапіўся, я прайграў яму ў кожную з гэтых гульняў па чарзе – у шашкі мы гулялі ўжо глыбокай ноччу, і мне дужа хацелася спаць, пагатоў мы абодва зрабілі перад гэтым сапраўды доўгі шлях. Пераканаўшыся, што гулец зь мяне ніякі, засмучаны Альбінос прапанаваў пабарукацца й выйграў разоў дваццаць запар. Тады ён разьюшыўся й нават выклікаў адміністрацыю, патрабуючы больш канкурэнтаздольнага суседа. Што і казаць: натуральна, яму адмовілі. Каб дагадзіць Альбіносу, я шчыра

пастараўся ўзяць рэванш у шахматах, самай інтэлектуальнай, як я вырашыў, гульні з тых, якія былі нам даступныя – і атрымаў мат ужо на шостым ходзе.

Такія ўспаміны трохі дапамагаюць мне трываць крык. Калісьці я любіў сваё цела, яно выглядала і адчувалася зручным іноскім – а цяпер бы я шмат чаго зьмяніў у ім, так, зьмяніў. Памяняў бы свае трагусы на што-небудзь больш прыдатнае ў гаспадарцы, напрыклад. Чалавечы арганізм мае важную асаблівасьць: калі доўга ўзьдзейнічаць на нейкі орган успрыманьня, ён перастае рэагаваць на раздражняльнік, або прынамсі рэагуе на яго ўсё слабей і слабей. Так мы ўратаваныя ад перагрузак жыцьця. Ня ведаю, ня ведаю: пакуль што галашэньне з-за сьцяны аніяк не прытупіла маё ўспрыманьне – наадварот, яно затачыла мае бедныя нэрвы, як лязо, затачыла да апошняй мяжы. І я змахваю з каленяў бясконцы мэталёвы пыл. Бо як можна звыкнуцца з крыкамі болю?

Выплюнуўшы ў кулак апошнюю костачку, Альбінос кладзецца на мой ложак і нібыта зьбіраецца трохі падрамаць. У тым, што гэта крык болю, я ня маю аніякіх сумненьняў – бы музыкант, я магу сёньня раскласьці катавальныя гукі на партыі. Аснову іх складае першасны, прымітыўны і ўсеабдымны боль, простае і адназначнае паведамленьне сьвету пра тое, што адну зь ягоных часьцінак пакінула гармонія, пырхнула кудысьці ўверх, крылцы разагнуліся — й зьніклі. Гэта ня вельмі цікава, а вось далей ідуць падрабязнасьці: вычурнай, мудрагелістай вязьзю, цыклічным узорам на белым болі выразаны верш пра тую д’ябальскую соль, якой пасыпаная першасная пакута – менавіта гэтая соль надае крыку разнастайныя мадуляцыі й вісклівыя ноткі, захлынаньні й роў. І нарэшце тое, куды вядзе ахвяру ўказальнік болю – нянавісьць да ўсяго, што магло б быць крыніцай пакуты, што знаходзіцца па-за болем, што не адчувае яго, што пазбаўленае яго. Стан, калі ахвяра становіцца некіраванай.

— Ну што я мушу зрабіць, каб гэта скончылася? Скажы, што? Чаго ты ад мяне хочаш?

Альбінос адплюшчвае адно вока й сонна ўзіраецца ў мяне, потым расчаравана заплюшчвае яго й паварочваецца на другі бок: маўляў, што зь цябе возьмеш?

— Ну хочаш, я зайдуся ў гістэрыцы, як баба – ты ж гэтага дамагаешся?

Альбінос пагардліва хмыкае.

— Хочаш, я адрэжу сабе вушы? Ці мне неабходна ламіцца ў дзьверы, каб паглядзець, каго вы там... Скажы ім, Альбінос, гэта ж ты загадаў ім, так?

Альбінос маўчыць. Адна ягоная нага лянотна сьцягвае з другой тапачак. Няспынныя крыкі з-за сьцяны замінаюць мне гаварыць, прамаўляць усе гэтыя ўшчувальныя словы даводзіцца праз сілу. Мне ажно балюча – відаць, таму, што насамрэч я таксама мусіў бы лямантаваць, а не займацца бязглуздымі ўгаворамі. Я бясьсільна абводжу вачыма пакой, ягоная звыклая сінь не дае мне ўзгадаць, як называюцца іншыя колеры: перада мной стол і стул, за падваконьнем – прыземістая шафа, справа ад яе – рукамыйнік, за крок ад яго ложак, на якім ляжыць сьпінай да мяне мой сусед. Тое, што ён увесь апрануты ў сіняе й блакітнае, даўно наводзіць мяне на думку, што Альбінос апынуўся тут невыпадкова. Я ведаю, што ў пакоі Альбіноса дакладна такі самы інтэр'ер. Мой позірк сьлізгае па фіялетавым паркеце.

— Паслухай, ну давай згуляем у ва што-небудзь, і калі я выйграю...

Ня ведаю, чаму я гэта прамовіў. Мае словы якраз заглушыў чарговы дзікі крык – так, мусіць, крычаць людзі, якіх рэжуць жыўцом, і Альбінос цалкам мог не пачуць, што ж я сказаў – аднак ён чуе, спружына ўсеўладнага азарту выпроствае яго на ложку, ён рэзка падымаецца ды рушыць да дзьвярэй у сваё логава, нешта задаволена мармычучы. Хутчэй за ўсё, выправіўся па свой чамаданчык.

— Пачакай! — я нахіляюся да падлогі. – Глядзі!

Зьверху даўно ўжо нехта раздражнёна грукае – відавочна, мы размаўляем надта гучна, спрабуючы перакрычаць няспынны енк. На маёй далоні ляжыць прасьценькі, белы гульняльны кубік з плястмасы, далёкі нашчадак рымскіх касьцей, напэўна, ён закаціўся да мяне ў пакой падчас нейкіх Альбіносавых практыкаваньняў. А можа, мой сусед выпусьціў яго з рук і паленаваўся шукаць – ён часта ходзіць туды-сюды вось так, трасучы ў далонях кубік: трэніруецца ў чаканьні моцных супернікаў, годных канкурэнтаў. Крыкі за сьцяной зноў нарастаюць, і я на сэкунду дакранаюся да сваіх трагусаў, так лягчэй.

Кубік ляжаў шасьцёркай уверх, я падымаю далонь да самага падбародзьдзя Альбіноса, набіраю ў лёгкія паболей паветра й кажу:

— Я выкіну шэсьць разоў па шэсьць...

Ён сьмяецца й хоча нешта сказаць, аднак я прымружваю вочы й працягваю:

— Шэсьць разоў па шэсьць, і калі я гэта зраблю, за сьцяной стане... Стане...

Раптоўная сьляза засьціць мне вока, робіць усё навокал нерэальным і хісткім:

— Ціха! –

ціха, ціха, супакойвае мяне Альбінос, з падазрэньнем разглядваючы між тым кубік: ці няма на ім выступаў, умяцінак, трэшчынак, усяго таго, што дапамагло б мне перамагчы. Я кладу руку на кнігу, быццам зьбіраючыся на ёй паклясьціся, нібы просячы падтрымкі ў найвышэйшых сілаў. Якая лухта.

— Дамовіліся, — Альбінос вяртае кубік мне й разгладжвае нябесна-блакітны абрус на стале. – Пачынай. Дарэчы, ты ніколі не выйграваў у лятарэю?

Я няўцямна гляджу на Альбіноса. У маіх складзеных разам далонях скача свае рабскія танцы кубік. Я не магу яму анічога адказаць. Ня будзеш жа яму тлумачыць, што я ніколі ня браў удзелу ў лятарэях, і ня браў з той простай і сьмешнай, мабыць, прычыны, што мне сорамна й няёмка – няёмка турбаваць лёс з такой дробнай нагоды. Я расьціскаю далоні. Кубік падскоквае й ледзь не зьлятае са стала.

Альбінос сьмяецца.

— Шчасьлівец ты наш! Ну, дурням заўсёды шанцуе. Спачатку.

Ён гаворыць нешта яшчэ, ужо сур'ёзна, я бачу, як падрыгвае ягоная ніжняя губа. Калі ж ён зьнямее, гэты голас, калі пяройдзе ў хрып ад болю, бясконцага болю, бязмэтнага болю. Бязмэтнага? Але хіба я ня стаў хвіліну таму ягоным сэнсам, ягоным апраўданьнем? Хіба ня даў надзею невядомай ахвяры, якая зьнішчыць нас абодвух, толькі паслабце ёй путы? Альбінос садзіцца на крэсла.

— Мне вельмі хочацца верыць, — чую я, — што гэтая шчырая гульня. Чыстая гульня. Што ты гуляеш за сябе, а не за...

Ён вялікім пальцам паказвае за сьпіну.

— А інакш гэта нейкае змаганьне... а змагацца я ні з кім не зьбіраюся. Разумееш, я гулец. Гулец!

Ён ганарліва падымае ўверх падбародзьдзе.

— Можаш быць спакойны, — мае ўмольна складзеныя далоні мімаволі намацваюць дзіўны рытм, які мне чамусьці зусім ня хо-

чацца ламаць. – Можаш быць спакойны. Я проста хачу, каб стала ціха. Гуляю сам за сябе. Мне пляваць, чым там займаюцца твае... Мне проста трэба за-ся-ро-дзіц-ца!

— Кідай, — злосна адказвае Альбінос. – Кідай ужо, ня карты тасуеш. Шэсьць. Во, блін.

Паміж намі ні з таго ні зь сяго ўзьнікае незразумелая, празрыстая прыязнасьць – грубаватая, недаўгавечная, але прыязнасьць, душэўная повязь ката і ахвяры. Альбінос кладзе руку мне на плячо, і калі б ня крыкі, якія з новай сілай б’юцца аб кволы борт майго розуму, я бы, далібог, жартаўліва тыцнуў бы цяпер суседа пад рэбры. Пакой раптам пачынае гайдацца перад вачыма, і я хапаюся рукамі за край стала, заплюшчыўшы вочы. Добра чуваць, як удар кубіку аб стол трапляе акурат паміж двума крыкамі – адзін на тон вышэй за другі, пякельная гама.

— Каб цябе! – з захапленьнем крэкча Альбінос. – Шэсьць! Дай я цябе пацалую!

Я паволі адплюшчваю вочы. Сіняя вопратка Альбіноса бруднай плямай распаўзаецца па маім пакоі колеру маладой травы, надае ўсяму вакол нешта балотнае, багнавае, прыдоннае. За вакном цямнее, непрытомнее, дранцьвее, і ўжо не відаць дарогі, па якой калісьці нас прывёз сюды стары аўтобус. Альбінос круціць у руках кубік, потым кладзе яго ў кішэню.

— Ты ніколі не працаваў у лякарні? – я бяруся за трагусы. – Або ў разьніцы?

— Не, — няўважна кідае Альбінос і дастае аднекуль іншы кубік. – Давай цяпер гэтым. Такі самы. Між іншым, ад цябе дрэнна пахне. Казлом...

Я ня гледзячы раблю кідок і гляджу Альбіносу ў вочы:

— Чатыры нуль.

— Так ня лічыцца! – енчыць ён. – Кідай па правілах.

І вось кубік зноў скача ў маіх руках. Невядома адкуль, але я ведаю, што й гэты кубік ня здрадзіць, — так і ёсьць, шасьцісьпінная пачвара кладзецца як трэба. Альбінос плюе мне пад ногі.

— Ты за каго мяне трымаеш? Хітры, так? Думаеш, ня ведаю я вашага брата? Думаў пад дурня закасіць?

Аднак потым Альбінос сьцішваецца, зьнясілена апускаецца на крэсла й безуважна ўжо сочыць, як я вытрасаю дробязь перамогі з кішэняў лёсу. Кубік коціцца да краю стала, ні мая, ні Альбіносава рука не пасьпяваюць накрыць яго, ляпаюць па жоўтым абрусе, сутыкаюцца, пераплятаюць пальцы... Мы стукаемся ілбамі й слу-

хаем, як кубік бразгае па падлозе. Ён спыняецца ў мэтры ад дзьвярэй у пакой Альбіноса. Я падымаюся зь месца, але тоўстая рудая рука хапае мяне ўпоперак грудзей й адпіхвае да ложку – зрэшты, досыць асьцярожна. Я падаю надта доўга, пасьпяваючы ўсьміхнуцца, і ўсхліпнуць, і сьцерці са шчок нешта, падобнае на ўзьбіты яечны жаўток, а калі падымаюся, вакол мяне спалохана кружляе сухое лісьце. Адным крокам я наганяю Альбіноса і ўчапляюся яму ў карак – ён ужо схіліўся над кубікам і працягнуў да яго лапу. Альбінос губляе раўнавагу – як на мой погляд, дык надта карцінна: мы валімся на падлогу і я адчуваю, колькі вагі ў маім суседзе, урэшце ён усаджваецца мне на жывот і хапае за шыю. Яшчэ імгненьне – і мы апынаемся пад сталом, месім адзін з аднаго адзін аднаго, лепім, ахайна пазбаўляючыся ад непатрэбнага. – Што гэта? – раптам хрыпіць Альбінос, — Што гэта ў цябе, вось тут? – і паслабляе хватку. – На лаціне гэта называецца tragus, — шапчу я, углядаючыся ў перапуджаныя зрэнкі Альбіноса. – Гэта такі храшчык, абцягнуты скурай...

НАЙНОЎШАЯ ГІСТОРЫЯ ПАЛЕСЬСЯ

Безумоўна, я здагадваюся пра прычыну такой увагі да сваёй асобы. Рэч у тым, што мне – і гэта не выпадак, не, гэта нечы геніяльны пас уросчырк, праз мокрае поле храналягічных табліцаў, скрозь лінейную абарону часу, пас, які імгненна пазбаўляе мяне надакучлівай пэрсанальнай апекі й выштурхоўвае ў небясьпечнай адзіноце да штрафной суперніка – дык вось, менавіта мне выпала сёньня стаць першым студэнтам за ўсе гады існаваньня нашай невялічкай дзяржавы, якому давядзецца адказваць на пытаньні білету №50. Экзамэнатараў трое, і кожны ўдае, што нічога звышбудзённага не адбываецца: анічога, анічога, усё да такой ступені трывіяльна, што варта мне нечакана прыўзьняць галаву над партай, як гэтыя трое мужчынаў палахліва адводзяць ад мяне свае пільныя позіркі, і не пасьпяваюць, і сарамліва пачынаюць фальшывым шэптам перамаўляцца пра вынікі расейскіх выбараў, усё так звычна, што неўзабаве ў аўдыторыю завітвае дэкан гістфаку й сядае акурат за маёй сьпінай, усё гэтак сумна, што лябарант, якога паклікалі да свайго стала сябры камісыі, быццам бы выпадкова забывае празь некалькі хвілінаў на суседнім стале адгорнуты на патрэбнай старонцы падручнік – пажадай я, і мог бы спакойна ім скарыстацца, ніхто б слова не сказаў. Насамрэч усе гэтыя людзі вакол дрыжаць ад нецярпеньня, бо ўсьведамляюць, што зьяўляюцца сьведкамі папросту гістарычнае падзеі.

Менш за ўсё тое, што тут адбываецца, мае дачыненьне да футболу.

Іх можна зразумець, гэтых людзей, дарослых, пляшыстых, мудрых. Дзеля таго моманту, які я падару ім праз – ого, ужо праз дзесяць хвілінаў! – яны гадамі мерзьлі на мітынгах, весела лаяліся ў пастарунках, дзекалі й цекалі, баяліся за дзяцей і жанок, плакалі й пілі гарэлку, а галоўнае – штодня душылі агідны фурункул сумненьня, які заўсёдна выскокваў у самых патаемных кутох іхных душаў, там, дзе цень вонкавай упэўненасьці надзейна захінае любую слабасьць. А сумненьне налівалася, пунсавела, сьвярбела зноў і зноў: а ці варта за гэта змагацца?...а ці варта працягваць?...або зьмірыцца на супакой сямейнікаў ды заклеіць на зіму вокны?... Іх можна зразумець, гэтых фанатыкаў, бо тут, у нашай невялічкай краінцы, яны атрымалі жывое ўвасабленьне сваіх мараў. Колькі

начэй запар яны акуналіся ў вольнае сеціва, каб вылавіць такі вось сон: студэнт рыхтуецца да іспыту, рыхтуецца адказваць на пытаньні білету №50, і ён вымушаны адказваць па-беларуску, і ён вымушаны адказваць праўду, і студэнту гэтаму мусіць быць прыемная такая працэдура, бо з вакна маладзён можа бачыць дрэўка на вежы берасьцейскай ратушы, загорнутае ў бел... так, так, правільна, ў бел-чырвона-белае палотнішча, і можа натхняцца ладным грукатам ботаў добразычлівых натаўскіх жаўнераў, што чуецца з плошчы, бо вучыцца тут студэнт, насуперак мінскім "галасам", фактычна бясплатна, атрымаў летась дзяржаўную стыпэндыю, амаль тысячу талераў, і на вучобу хапае, і на кватэру ў Пружанах – ня ўсім, натуральна, тут так шанцуе.

Краіна, у якой я нарадзіўся, нагадвала футбольнае поле бяз брамак, трыбуны раўлі блатныя песенькі – зрэшты, гэта была тэрыторыя майго маленства, кукурузныя палачкі ў цукры, мама й тата, у такім узросьце ты папросту ня маеш адпаведнага органу, каб ненавідзець; краіна, у якой я паступіў ва ўнівэрсытэт, была меншая й страшнейшая, аднапакаёўка ў хрушчоўцы, перарobленая пад катавальню – вось яе, наколькі памятаю, я ненавідзеў ужо сьвядома, зь перакананасьцю сярэднявечнага пурытаніна, я заўжды ненавідзеў яе, цяжка нават апісаць, як я яе ненавідзеў, яе жыхароў, мову, звычаі, стравы, краявіды. Колькі сябе памятаю, я заўжды пачуваўся там невылечна хворым – на сындром прыроджанага эўропадэфіцыту, я задыхаўся між цесных ягадзіцаў радзімы. Фізычная агіда да яе шэрых дыяфільмаў падмінала пад сябе любыя спробы любові, яе сталінскі ампір каменем ляжаў на грудзях; калі ў гэтай дзяржаве нешта адбывалася, я бачыў перад сабой сьлізкага паўзуна, аганізуючага, з кавалкам чалавечыны, што зьвісае зь ліпучых, вільготных, нібы падлога бясплатнай прыбіральні, тоўстых губ, і паўзун марудна круціўся вакол уласнай восі, пэцкаючы аслупянелае сваё атачэньне – дагэтуль лічу, што гэта найлепшая, няхай і даволі банальная, мэтафара для любой, нават самай міралюбнай дзейнасьці маёй бацькаўшчыны. О Тварог і ўсе малочнакіслыя паганскія багі, як я яе ненавідзеў! Мне катастрафічна не ставала эўропы. Я марыў толькі пра адно – пасадзіць на сьпіну заплечнік і перайсьці заходнюю мяжу. Я быў гатовы стаць кім заўгодна – палякам, немцам, грэкам, італьянцам, баскам, ірляндцам, літоўцам, вугорцам, фарэрцам, абы толькі змыць зь сябе сапраўднае сваё паходжаньне. Я стаў горбіцца – як жа інакш, калі на твае кволыя плечы ціcьне сорам за дзесяць мільёнаў суай-

чыньнікаў. Мне казалі: фу, эўропа, паўсюль адно й тое, ізаляцыя, глябалізацыя, дэвальвацыя, пыха й пуга, транснацыянальныя карпарацыі, бяздушныя бюргеры, мы для іх ніжэйшая раса, далася табе гэтая эўропа, гэтая маразматычная фрэкэн Бок; мне казалі: ты ж нават ня быў ніколі па той, нібыта шчасьлівы бок мяжы, вось і ідэалізуеш, ідэалізуеш, верыш казкам, казкам, а яны надта ўжо часта насамрэч апынаюцца каскамі, каскамі...

Я ня слухаў. Дакладней, я завёў сабе трэцяе вуха, замаскаваўшы яго ў гушчары сваёй шэвелюры, і ўсю горкую атруту сваіх суразмоўцаў, усю іхную неперааймальную жоўць зліваў туды, у ратавальны рэзэрвуар па-над мозгам, дзе яна раскладалася на бясьпечныя й бессэнсоўныя рэчывы, што адразу ж па заканчэньні гэтай кароткай працэдуры адпраўляліся ва ўраўняльнае, млоснае беларускае паветра. Мае ж прыродныя, натуральныя вушы чулі толькі тое, што мне хацелася чуць. Кнігі ды інтэрнэт давалі мне трохі скрыўленую, але тым ня менш прывабную карціну Заходняй Эўропы, якую я, як мне здавалася, з посьпехам выгінаў да рэальнага адлюстраваньня. Прызнаючы той факт, што нішто ў сьвеце не заслугоўвае катэгарычнай ацэнкі, і пагаджаючыся, што адно неабходнасьць выбару стварае чалавечыя каштоўнасьці, я тым ня менш з жахам заўважаў: усё, што выклікае маю сымпатыю або інтарэс, месьціцца там, у маім эльдарада, усё, што я бы хацеў набыць на гэтай агромністай вэдээнгэ прадметаў і пачуцьцяў, якую называюць нашай плянэтай, знаходзіцца дзе заўгодна, але ня тут, усё, што я люблю, створана за мяжою. Там, дзе я жыў, на паўдзікія чалавечыя асобіны палявалі толькі мярзота, дэградацыя й гвалт – хрумсьцячы храшчыкамі, трупы даядала дзяржава, народаў братэрскі саюз, неяк я бачыў яго з бархану, гэтага трохгаловага мутанта: зубаты рот, driчок і струк; навокал стаяў няспынны енк гіенаў і старшыняў мясцовых саветаў. Я шчыра спрабаваў адшукаць хаця б каліва чыстага-сьветлага на запусьцелай тэрыторыі, дзе вымушаны быў існаваць, але апрача каменных стодаў й бэтонных хрэнаў з макам, густа раскіданых па бацькаўшчыне, не знайшоў анічога.

Сябры неўзабаве адвярнуліся ад мяне, бо мая гістэрычная любоў да любога прыхадня адтуль падавалася ім паталягічнай. Замежнікі прыводзілі мяне ў балючую роспач, я быў на мяжы – яшчэ адной шчасьлівай мяжы, па другі бок якой мусіць сьвяціць сапраўднае сонца, — на мяжы вар’яцтва. Я жыў пад штосэкунднае бубненьне недзе за сьпінай: эўропа, эўропа, там жа чалавек чалавеку

воўк, там жа людзі існуюць адасоблена адзін ад аднаго, ні сяброўства, ні суседзтва, ні дармаедзтва, ні калектывізму, ні ўзаемавыручкі... На ўзаемавыручцы мяне зарубала, я рэзка паварочваўся й крычаў: хачу без суседзтва, хачу без калектывізму, хачу без узаемавыручкі!...хачу без вас!... Вагон маўчаў і глядзеў на мяне са шкадаваньнем. Неяк я ўвесь вечар прабавіў у кампаніі галяндцаў, іх было чалавек дваццаць, яны не разумелі ні часьціцы па-расейску, я размаўляў зь імі на нейкай неданошана-крэольскай ангельскай – у якасьці перакладчыкаў ўдала выступалі дзесяць бутэлек белавескай і дзесяць піўных фаўстпатронаў. Ап’янелы, я сядзеў між беларусаў і тупа злаваўся на тое, што ў размовах паміж сабой яны хераць галяндцаў уздоўж і ўпоперак. Мае дарагія замежнікі кранальна махалі рукамі й дружалюбна сьмяяліся. Апоўначы галяндцы разьвіталіся з гаспадаром і сыйшлі. Хвілінаў празь пятнаццаць паперся дахаты і я. У мэтро я заснуў, а разбудзіў мяне жыцьцярадасны сьмех над галавой і вясёлая размова пра абстаноўку ў нашых кватэрах. Я падняў вочы й наткнуўся позіркам на тых самых галяндцаў. Яны размаўлялі па-расейску, прычым без аніякага акцэнту. Увесь шлях дамоў я праседзеў, апусьціўшы вочы й дыхаючы ў шалік, на канцавой станцыі мяне прыбраў мент.

Вар’яцтва, вар’яцтва... – зрэшты, яно адступала, калі замежнікі да пары зьнікалі. Тады я гуляў у футбол. Можа быць, хто-небудзь ведае пра FIFA-99, кампутарную гульню, цудоўны сымулятар, даўно, калі напраўду, састарэлы. Я пачаў зь некалькіх таварыскіх матчаў, гуляў жартам, без аніякага жаданьня перамагаць, але неўпрыкмет захапіўся й хутка ўжо гадзінамі ганяў віртуальных мужыкоў з тварамі кланаваных дэбілаў па зялёнай траўцы. Шчыра кажучы, да футболу й спорту навогул я быў тады больш чым абыякавы – у той, прамінулай краіне ён зьяўляўся чымсьці кшталту дзяржаўнай рэлігіі, і натуральна, што я плаціў спорту нянавісьцю. Але мой футбол быў нечым большым за футбол. У адзін перадкалядны вечар я адкрыў, што каманды і іхныя колеры можна прыдумваць самому, можна нават узяць на сябе функцыі футбольнай маткі й нарадзіць, апладніўшыся ўласнай фантазіяй, цэлыя лігі, ахрасьціўшы іх на свой густ. Беларусі ў сьпісе камандаў не было, я не марудзячы сьцёр з зямной паверхні Бэльгію, і ўжо ўвечары пад флямандзкім сьцягам бегалі фаміліянты маіх сяброў. А на наступны дзень на сьвет зьявілася Палеская рэспубліка. Белчырвона-белы сьцяг аб’ядноўваў шаснаццаць футбольных клюбаў і тэрыторыю ад Берасьця да Гомлі. На карэйскі лад нешматлікія

дэмакратычныя сілы маёй роднай пустэльні ўтварылі на яе поўдні вольную і эўрапэйскую краіну – такімі працэсамі поўнілася *мая* сусьветная гісторыя. Уяўленьне імгненна дабудавала падрабязнасьці. “Вітаўт” біўся з “Рэалам” у Лізе чэмпіёнаў, палеская зборная марна змагалася за выхад у фінал чэмпіянату сьвету, і ў той жа час Палеская рэспубліка ня мела дыпляматычных стасункаў толькі зь Беларусяй, Расеяй і некалькімі вечна рэвалюцыйнымі дзяржавамі ўсходу. Польская тэлевізыя казала пра жорсткі крызыс, нашы паўночныя суседзі спрабавалі вярнуць палешукоў да карыта, пасьля доўгіх сумненьняў ната ўзяла рэспубліку пад сваю абарону. Рэспубліка Чарнобыль – так нас называюць цяпер на поўначы вядучыя панарамы. Спачатку было цяжка, потым умацаваўся талер, наладзіўся гандаль – я ніколі ня быў спэцыялістам па гэтых эканамічных пушчах. Урэшце, я толькі гуляў у кампутарны футбол, і да плённай працы бактэрыяў свабоды ня маю аніякага дачыненьня.

— Білет нумар пяцьдзесят, — кажу я прыцішана, але ўпэўнена. – Утварэньне Палескай рэспублікі і яе станаўленьне на міжнароднай арэне. У 2021 годзе...

Яны слухаюць мяне, паўзакрыўшы змораныя вочы. З твару на твар, нібы мяч ад гульца да гульца, пераскоквае экстаз. Яны перамаглі. Я – сымболь іхнае перамогі. Я распавядаю пра візыт амэрыканскага прэзыдэнта, забываю дату ўвядзеньня палескага пашпарту, але спрытным фінтам абыходжу яго й пачынаю крытыкаваць Раду. Яны пахмурнеюць, бо ўсе зьяўляюцца яе дэпутатамі. Краіна мудрых гісторыкаў і кепскіх паэтаў. Што казаць, калі наш прэзыдэнт – аўтар гістарычных раманаў. Я атрымліваю сваю адзнаку, здаецца, вышэй за яе не бывае, але мне ўсё адно. У Палескай рэспубліцы дыплём – не сьвятыя мошчы. Дэкан даганяе мяне й паціскае руку. Гэта – трэцяя краіна, у якой мне давялося жыць. Спадзяюся, апошняя. Бацькі засталіся старэць у той, страшнай, другой. Там я мог бы стаць мастаком і музыкантам, пісьменьнікам або забойцам. Тут я стану мэнэджарам кампаніі “Puma-Palessie” або рэклямным агентам за чатырыста талераў у тыдзень.

У дзьвярох я спыняюся і абарочваюся. Экзамэнатары глядзяць на мяне са зьдзіўленьнем, грубая, рабатызаваная радасьць яшчэ сьвеціцца на іхных тварах – тварах пэрсанажаў кампутарных гульняў старой генэрацыі.

SPIS TREŚCI

ЗЬМЕСТ

Alhierd Bacharewicz urodził się w 1974 roku w Mińsku. Jest autorem książek: *Praktyczny poradnik niszczenia miast* (2002), *Barwy naturalne* (2003), *Żadnej litości dla Walentyny H*. (2006), *Przeklęci goście stolicy* (2008). W sondażu białoruskiego pisma *Nowa Europa* został uznany za najlepszego pisarza białoruskiego 2006 roku. Jego utwory były tłumaczone na języki: niemiecki, czeski, ukraiński, bułgarski i słoweński. Mieszka i pracuje w Hamburgu.

biblioteka białoruska

Pod patronatem Ministra Kultury
i Dziedzictwa Narodowego RP

Alhierd Bacharewicz to wschodząca gwiazda literatury białoruskiej. Trzydziestotrzyletni prozaik z Mińska, od kilku lat mieszkający w Hamburgu, wydał do tej pory na Białorusi cztery książki: *Praktyczny poradnik rujnowania miast* (2002), *Barwy naturalne* (2003), *Żadnej litości dla Walentyny H.* (2006) i *Przeklęci goście stolicy* (2007). Obecnie przygotowuje powieść zatytułowaną *Sroka na szubienicy*.

Jan Maksymiuk

odra

Międzynarodowy
Przegląd
Polityczny

TYGODNIK POWSZECHNY

www.bialorus.pl

ISBN 978-83-89185-80-8